ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 71 (2124)
2 верасня 1966 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

Новы цэнтр тэхнічнай эстэтыкі

ГОД НАЗАД у нашай газеце была змешчана інфармацыя аб стварэнні па ініцыятыве ЦК камсамола рэспублікі грамадскага штаба тэхнічнай эстэтыкі. Маладыя спецыялісты, якія ўваходзілі ў яго, — архітэктары, мастакі, інжынеры, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў—за час існавання штаба правялі вялікую і карысную работу. Яны не толькі прапагандавалі ідэі тэхнічнай эстэтыкі, але і старанна вывучалі справы на месцах, актыўна ўдзельнічалі ў рабоце створанага пры былым Саўнаргасе мастацка-тэхнічнага савета, які зацвярджаў новыя ўзоры прамысловай прадукцыі, дамагаліся іх высокай эстэтычнай вартасці.

Аналіз работы паслужыў асновай для падрыхтоўкі дакументаў, з якімі штаб звярнуўся ў Савет Міністраў БССР. Гэта было хадайніцтва аб арганізацыі ў Беларусі спецыяльнага мастацка-канструктарскага бюро, якое б стварала для прамысловасці высакаякасныя і прыгожыя ўзоры вырабаў. Хадайніцтва атрымала падтрымку. Аднак было прызнана больш мэтазгодным заснаваць у рэспубліцы не бюро, а інстытут, каб больш кваліфікавана і шырока вырашаць пытанні развіцця беларускага прамысловага мастацтва.

І вось 27 мая 1966 года ў Дзяржаўным камітэце па навуцы і тэхніцы пры Савеце Міністраў СССР быў падпісаны загад аб стварэнні Беларускага філіяла Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута тэхнічнай эстэтыкі.

Карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» пабываў у новай навукова-даследчай установе і звярнуўся да выконваючага абавязкі дырэктара інстытута Б. Н. Грубіна з радам пытанняў.

Гутарка пачалася з бліжэйшых праблем, якія павінен вырашаць інстытут.

— Пакуль што,—гаворыць Барыс Натанавіч,—мы перажываем перыяд станаўлення. Камплектуем кадры, вядзём будаўніцтва свайго памяшкання (інстытут часова займае адно з памяшканняў спецыяльнага канструктарскага бюро № 3), вырашаем іншыя арганізацыйныя і гаспадарчыя пытанні.

Інстытут, можна сказаць, ужо вызначыў свой асноўны профіль. У агульных рысах наша задача такая: распрацоўка і ўкараненне метадаў мастацкага канструявання вырабаў машынабудавання і тавараў культурна-бытавога прызначэння з мэтай паляпшэння іх эксплуатацыйных і эстэтычных якасцей. Гэта значыць, што нам трэба распрацаваць тыпавыя патрабаванні і рэкамендацыі, якія дазвалялі б надаваць самым розным вырабам найбольш мэтазгодную, зручную ў эксплуатацыі і прыгожую на выгляд форму, паляпшалі б і спрашчалі іх знешняе афармленне і ўпакоўку.

Адсюль вынікае другая задача, якая даручана інстытуту,—каардынаваць у галіне мастацкага канструявання ўсю навукова-даследчую і вопытна-канструктарскую дзейнасць. Для гэтага нам неабходна вывучаць і абагульняць увесь айчынны і зарубежны вопыт. Сапраўды, перш чым штосьці рэкамендаваць, мы павінны ведаць, якія існуюць тэндэнцыі развіцця тых ці іншых відаў тавараў; якія эксплуатацыйныя і эстэтычныя патрабаванні да іх ставяцца сёння і будуць ставіцца заўтра; якія функцыі вырабаў будуць у бліжэйшыя гады вядучымі, а якія будуць адыходзіць і саступаць месца другім, а значыць—уплываць на кан'юнктуру формы і стылявыя напрамкі; што ў гэтым зменлівым працэсе будзе адлюстроўваць толькі выпадковыя павевы моды, а што—асноўныя аб'ектыўныя заканамернасці. Толькі комплекснае вывучэнне праблемы паможа, напрыклад, забяспечыць канкурэнтную здольнасць нашых вырабаў на зарубежным рынку. А гэта вельмі важна, калі ўлічыць, што Беларусь гандлюе сёння з многімі краінамі свету.

— Але эканамічныя фактары, відаць, толькі адзін бок справы?

— Безумоўна. Асноўны напрамак нашай работы—садзейнічаць стварэнню такога прадметнага асяроддзя, якое спрыяла б фарміраванню найбольш аптымальных умоў працы і быту, грамадскага і асабістага жыцця савецкіх людзей, а гэта значыць і фарміраванню новага чалавека.

— Са сказанага відаць, што вам давядзецца вырашаць не толькі вузкатэхнічныя пытанні, але і больш шырокія, звязаныя з развіццём усёй нашай матэрыяльнай і духоўнай культуры—сацыяльна-эканамічныя, філасофскія, мастацтвазнаўчыя.

— Гэта так.

— Тады дазвольце паставіць яшчэ адно пытанне. Пералік памянённых вамі праблем—вельмі складаных і разнастайных—павінен, відаць, вызначыць і структуру інстытута, абумовіць пэўную арганізацыю навуковых распрацовак?

— Спачатку пра арганізацыйны бок справы. Усю сваю дзейнасць інстытут будуе, выходзячы з дзвюх, калі можна так сказаць, форм узаемаадносін з установамі і арганізацыямі. Па-першае, ён будзе весці свае асноўныя планавыя навукова-даследчыя распрацоўкі, вызначаныя заданнямі Дзяржкамітэта па навуцы і тэхніцы. У гэтых адносінах наш філіял вызначаны як галоўная арганізацыя ў краіне па формаўтварэнню сельскагаспадарчых машын, калёсных трактараў і вялікагрузных аўтамабіляў. Наяўнасць у рэспубліцы адпаведнай прамысловай базы—важны аргумент у карысць такога рашэння.

Другой нашай асноўнай тэмай з'яўляецца навукова-даследчая распрацоўка і эксперыментальнае праектаванне службовых інтэр'ераў і арганізацыя найбольш аптымальных умоў працы ў іх. Сюды ўвойдуць памяшканні дзяржаўных устаноў, канторскія службы, офісы. Апрача таго, улічваючы, што Беларусь з'яўляецца заходнімі варотамі краіны і праз яе тэрыторыю ажыццяўляюцца шырокія турысцкія і культурна-эканамічныя кантакты, мы будзем займацца комплекснай распрацоўкай атэляў, гасцініц, кемпінгаў, матэляў, турбаз. Хачу агаварыцца—мы тут не будзем канкурыраваць з існуючымі архітэктурна-праектнымі арганізацыямі, не будзем дубліраваць іх, бо пытанні комплекснага абсталявання ўстаноў падобнага тыпу ў краіне ніхто не вырашае.

[Заканчэнне на 2-й стар.].

НА РУБЯЖАХ ПЯЦІГОДКІ

Час нараджэння магутных скрэпераў з маркай «МоАЗ» на радыятары — першы год пяцігодкі, калі завод пад'ёмна-транспартнага абсталявання ў Магілёве атрымаў новую назву: «Магілёўскі аўтамабільны завод імя С. М. Кірава».

Сёння «МоАЗы» можна ўбачыць ужо ва ўсіх кутках нашай Радзімы. 300 машын ужо атрымалі мэліяратары і будаўнікі. Да канца года з варот завода выйдзе яшчэ сто скрэпераў.

У магілёўскіх аўтамабілебудаўнікоў вялікія планы. У 1968 годзе на прадпрыемстве пачнецца выпуск 18-тонных аўтасамазвалаў павышанай праходнасці. Першая доследная партыя такіх машын (адну з іх вы бачыце на здымку) праходзіць ужо заводскія выпрабаванні.

Беларусь стала радзімай яшчэ адной выдатнай маркі аўтамашын.

Фота М. МІНКОВІЧА.

САЛІДАРНАСЦЬ, ДРУЖБА, АДЗІНСТВА

Пад лозунгам салідарнасці, дружбы, адзінства 30 жніўня ў Баку пачало сваю работу пашыранае пасяджэнне Савецкага камітэта па сувязях з пісьменнікамі краін Азіі і Афрыкі. У сталіцу Азербайджана прыехалі госці амаль з 30 замежных краін. Гэта Ні Фуанг (ДРВ), Мулк Радж Ананд (Індыя), Коба Абэ (Японія), Азіз Несін (Турцыя), Джозеф Норт (ЗША), Ладыслаў Мнячка (Чэхаславакія), Ангел Тодараў (Балгарыя) і многія іншыя вядомыя майстры слова. Сярод савецкіх пісьменнікаў, удзельнікаў пасяджэння, — народны паэт Беларусі Пятрусь Броўка і Андрэй Макаёнак.

Адкрыў пасяджэнне старшыня Савецкага камітэта па сувязях з пісьменнікамі краін Азіі і Афрыкі Сарвар Азімаў. Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Азербайджанскай ССР М. А. Іскендзераў зачытаў прывітанне ЦК КП Азербайджана, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў рэспублікі ўдзельнікам пасяджэння.

З дакладам аб ролі пісьменнікаў ва ўмацаванні салідарнасці з в'етнамскім народам, які змагаецца супраць агрэсіі амерыканскага імперыялізму, выступіў старшыня аргкамітэта па падрыхтоўцы пашыранага пасяджэння, першы сакратар Саюза пісьменнікаў Азербайджана Мірза Ібрагімаў.

— З гэтай трыбуны, — сказаў ён, — я заяўляю ад імя шматтысячнай арміі савецкіх літаратараў, ад імя ўсяго нашага вялікага народа: мы з вамі, нашы в'етнамскія браты!

Цёпла сустрэлі прысутныя паслание Міхаіла Шолахава, у якім гаворыцца аб ролі пісьменніка ў жыцці народа, аб яго адказнасці перад часам. Вялікі рускі празаік, у прыватнасці, піша аб бакінскім пасяджэнні: «Гэта не звычайная сустрэча пісьменнікаў, дзе часам можа адбывацца абмен думкамі толькі па пытаннях выключна літаратурнага парадку. Тут па сутнасці справы пойдзе гаворка аб самім прызванні пісьменніка, аб сэнсе нашай працы, аб адказнасці пісьменніка перад чалавецтвам».

Удзельнікі пасяджэння заслухалі таксама даклад казахскага пісьменніка Габіта Мусрэпава «Тэма нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў савецкай літаратуры апошніх год» і прывітальныя паслані Канстанціна Федзіна, Шарафа Рашыдава і Ільі Эрэнбурга.

Першы дзень бакінскай сустрэчы завяршыўся вялікім інтэрнацыянальным літаратурным вечарам. Свае творы, прасякнутыя пачуццём салідарнасці з гераічным народам В'етнама, пратэстам супраць амерыканскай агрэсіі, прачыталі Канстанцін Сіманаў, Мірзо Турсун-задэ, індыйскі паэт Алі Сардар Джафры, Яўген Еўтушэнка, Міхаіл Луконін, паэт з Дагамеі Рышар Догбе, Маргарыта Алігер і іншыя.

У другі дзень работы пашыранага пасяджэння Савецкага камітэта па сувязях з пісьменнікамі краін Азіі і Афрыкі дэлегаты абмяркоўвалі даклады М. Ібрагімава і Г. Мусрэпава. Выступілі пісьменнікі з многіх краін, і ўсе яны гаварылі аб сваёй поўнай падтрымцы справядлівай барацьбы в'етнамскага народа супраць агрэсараў.

Бакінская сустрэча сагрэта цеплынёю дружбы і салідарнасці. Кіраўнік дэлегацыі пісьменнікаў Паўднёвага В'етнама член праўлення Вызваленчай асацыяцыі культуры Фан Ты ў гутарцы з карэспандэнтам «Правды» сказаў: «Як раней, так і зараз савецкі народ і савецкія пісьменнікі аказваюць змагаючамуся в'етнамскаму народу маральную і матэрыяльную падтрымку ў барацьбе супраць амерыканскай агрэсіі. Сустрэчу ў Баку мы разглядаем як новае праяўленне гэтай падтрымкі».

БЕЛАРУСЬ АРХІТЭКТУРНАЯ

НОВЫ КІНАТЭАТР

Гэты новы кінатэатр нязвыклай авальнай формы мяркуецца паставіць у Мінску. Масіўны авал у пярэдняй частцы зрэзаны наўскасяк і, здаецца, вісіць у паветры. Адкрытая тэраса на ўзроўні другога паверха падкрэслівае лёгкасць і трываласць бетонных канструкцый.

Прадумана зроблена ўнутраная планіроўка. Кінатэатр разлічаны на 1 400 чалавек. У яго авальнай зале з амфітэатрам можна будзе глядзець не толькі фільмы. Тут можна будзе праводзіць розныя сходы, пасяджэнні. Перад шырокафарматным, даўжынёю 24 метры экранам знаходзіцца сцэна глыбінёй 8 метраў. Апошні рад крэслаў, нягледзячы на вялікую залу і адсутнасць балконаў, не надта аддалены ад экрана.

Фае будзе зроблена так, каб чалавеку, які прыйшоў глядзець кіно, даць як найбольш зручнасцей для адпачынку. На першым паверсе — вялікае фае з кафэ, танцавальнай пляцоўкай, эстрадай, гардэробам. Тут няма перагародак, адна прастора «перацякае» ў другую. Лесвіцы вядуць на другі паверх, дзе знаходзіцца другое фае з нахільнай столлю і паўкруглай шкляной сценкай. Тут можна зрабіць месца ціхага адпачынку.

Новы будынак плануецца выканаць у маналітным жалезабетоне і шкле. Аўтары—архітэктары «Белдзяржпраекта» С. Філімонаў, В. Малышаў і інжынер В. Каржэўскі (па іх праекту выканана Мінская спартыўна-канцэртная зала на Паркавай магістралі)—сёння распрацоўваюць праектнае заданне новага кінатэатра.



ПЕРАД НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ

Адбыўся сход партарганізацыі Саюза пісьменнікаў Беларусі, прысвечаны новаму навучальнаму году ў сетцы палітасветы. З дакладам выступіў Аляксей Кулакоўскі. У спрэчках прынялі ўдзел Піліп Пестрак, Іван Шамякін, Кастусь Кірэенка, Мікола Ткачоў, Уладзімір Юрэвіч, Алесь Бачыла, Заір Азгур, Іван Грамовіч. Сход вызначыў асноўны кірунак работы семінара па пытаннях марксісцка-ленінскай філасофіі, у якім будуць займацца ў новым навучальным годзе беларускія літаратары.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ

За заслугі ў развіцці савецкага тэатральнага мастацтва і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння артыстка Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы Браварская Зінаіда Іванаўна ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Уолтэр Мей—госць Саюза пісьменнікаў

Па запрашэнню Саюза пісьменнікаў СССР і Таварыства культурных сувязей з заграніцай у нашай краіне гасціў англійскі паэт Уолтэр Мей. Днямі ён прыехаў у Беларусь, стаў госцем літаратараў нашай рэспублікі.

Уолтэр Мей — выкладчык аднаго з каледжаў, паэт, даўні сябра і перакладчык савецкай паэзіі. Ён стварыў своеасаблівую анталогію рускай паэзіі, пераклаўшы творы амаль усіх буйнейшых яе прадстаўнікоў. Вершы Ламаносава, Дзяржавіна, Пушкіна, Някрасава, Ясеніна, Блока, Маякоўскага, Твардоўскага, Вінакурава, Слуцкага, Еўтушэнкі, Ахмадулінай і многіх іншых сталі добра вядомы чытачам Англіі дзякуючы яго шматгадовай перакладчыцкай дзейнасці.

У апошнія гады Уолтэр Мей зацікавіўся творчасцю беларускіх паэтаў. Яму спадабаліся вершы Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Петруся Броўкі. Ён пераклаў некалькі дзесяткаў іх твораў, стаў глыбей вывучаць сучасную паэзію Савецкай Беларусі.

У аўторак, 30 жніўня, у Саюзе пісьменнікаў Беларусі адбылася сяброўская гутарка з англійскім госцем. Іван Шамякін, Міхась Лынькоў, Максім Лужанін, Аляксей Русецкі, Мікола Ткачоў, Язэп Семяжон, Алесь Бачыла, Еўдакія Лось, Нічыпар Пашкевіч, Пятро Шасцерыкоў, Генадзь Бураўкін абмяняліся з Уолтэрам Меем думкамі аб умацаванні кантактаў паміж перакладчыкамі розных краін, аб некаторых пытаннях развіцця сучаснай літаратуры.

Наш госць расказаў аб цяжкасцях, з якімі яму даводзіцца сутыкацца ў перакладчыцкай рабоце, аб становішчы літаратараў у сучаснай Англіі, аб тым, як часта лонданскія выдаўцы прапануюць чытачам «бестселеры», вельмі далёкія ад сапраўднай літаратуры.

Беларускія літаратары пазнаёмілі У. Мея з апошнімі дасягненнямі нашай прозы і паэзіі, цікавіліся, як шырока вядомы англійскаму чытачу навінкі савецкай літаратуры.

Уолтэр Мей чытаў свае новыя вершы, прасякнутыя гуманізмам і вялікім аптымізмам.

Перакладчыкам у час гэтай вельмі шчырай таварыскай гутаркі быў Язэп Семяжон, які даўно завочна знаёмы з У. Меем і вёў з ім вялікую перапіску.

На здымку вы бачыце момант гутаркі ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі. Другі злева — Уолтэр Мей.

КРОКІ ФЕСТЫВАЛЮ

«ЧОРНАМУ КАТУ»— АДСТАЎКУ!

У якой бы культурна-асветнай установе Краснапольскага раёна зараз ні пабываў, усюды разгортваецца падрыхтоўка да фестывалю самадзейнага мастацтва. Часцей збіраюцца на рэпетыцыі самадзейныя спевакі, танцоры, дэкламатары, драмгурткоўцы. Нараджаюцца новыя калектывы мастацкай самадзейнасці. Напрыклад, пры Мхініцкай участковай бальніцы створан драматычны гурток, кіраваць якім узяўся рэжысёр Краснапольскага народнага тэатра Уладзімір Чарапнін. Новы гурток ужо рыхтуе спектакль па аднаактовай п'есе «Дзяжурства». Неўзабаве ён будзе паказаны сельскім гледачам. Ствараецца харавы калектыў пры Мхініцкай сельскай бібліятэцы.

Ва ўсіх установах культуры прайшлі абменныя канцэрты. Неўзабаве пачнуцца куставыя агляды самадзейных калектываў, а там і справаздачныя канцэрты ў раённым Доме культуры. Нядаўна адбыўся семінар кіраўнікоў харавых і драматычных калектываў, неўзабаве склікаецца семінар кіраўнікоў агітацыйна-мастацкіх брыгад.

Уся арганізацыйная работа зводзіцца да таго, каб актывізаваць творчае жыццё ў калектывах. Але бывае і такое, калі самадзейны калектыў траціць шмат часу на падрыхтоўку чарговага канцэрта, а збяруцца людзі паслухаць яго выступленне і разыходзяцца незадаволеныя. Часцей за ўсё незадаволенне гэта выклікана не столькі слабым майстэрствам артыстаў, колькі беднасцю рэпертуару. Звычайна ў пачатку канцэрта хор або вакальны ансамбль выканае адну-дзве патрыятычныя песні, потым выступяць індывідуальныя выканаўцы: салісты-спевакі, танцоры, дэкламатары. Прычым многія нумары настолькі, як кажуць, прыеліся, што дастаткова таму ці іншаму артысту паказацца на сцэне, як кожны ведае, што будзе зараз расказана ці праспявана. Гледачу дастаткова пачуць прозвішча Валянціны Саўчанка з Сідараўскага сельскага клуба, і ён адразу здагадаецца, што Валянціна будзе чытаць верш Якуба Коласа «Святы Ян», а Галя Юдзенка—удзельніца мастацкага калектыву Клясінскай сельскай бібліятэкі — абавязкова праспявае «Чорнага ката».

Ужо некалькі гадоў вандруюць з аднаго сельскага калектыву ў другі, а ў некаторых атрымалі пастаянную прапіску такія творы, як «Хама» Э. Валасевіча, «Сцяпанавы кішэні» Ул. Корбана. Ніхто не супраць гэтых твораў. Але трэба, каб рэпертуар спевака ці дэкламатара папаўняўся новымі нумарамі. Толькі тады можа сталець майстэрства самадзейнага артыста.

Чым жа растлумачыць аднастайнасць і беднасць рэпертуару сельскіх калектываў? Перш за ўсё тым, што гэтым пытаннем мала займаецца абласны Дом народнай творчасці. Раённы аддзел і Дом культуры больш атрымліваюць з абласнога Дома народнай творчасці розных цыркуляраў, чым добрых рэпертуарных матэрыялаў.

Сёлета было вырашана правесці ў калгасах і саўгасах раёна Свята вясны. Работнікі культуры спадзяваліся на дапамогу абласнога Дома народнай творчасці, які абяцаў даслаць сцэнарыі. Але дапамога прыйшла тады, калі ў большасці гаспадарак раёна Свята вясны адбылося.

І цяпер самадзейныя артысты не адчуваюць патрэбнай дапамогі ад абласнога Дома творчасці. Пакуль што атрыманы толькі анатаваныя спісы рэкамендацыйнай літаратуры. Няўжо гэтым можна абмежавацца? Ненармальна ў дзейнасці абласнога Дома народнай творчасці і тое, што яго метадысты — рэдкія госці ў раённым цэнтры, не гаворачы ўжо аб сельскіх клубах.

У жніўні ў Краснаполлі праходзіў трохдзённы семінар работнікаў культуры. Дарэчы, дату правядзення яго вызначылі ў Доме народнай творчасці. Спадзяваліся, што на семінар прыедзе нехта з метадыстаў, каб даць канкрэтныя парады сельскім культармейцам. На жаль, нікога з метадыстаў не было.

Наша краіна набліжаецца да 50-годдзя Савецкай улады. Да гэтай знамянальнай даты павінны актыўна рыхтавацца культурна-асветныя ўстановы. Аднак у рэпертуары самадзейных калектываў раёна яшчэ мала твораў аб нашай Радзіме, яе стваральніку Ул. І. Леніне. Напрыклад, у рэпертуары харавога калектыву Сабалеўскай бібліятэкі «Песня аб Леніне» Холмінава, «Разгарэлася зорачка ясная» Цікоцкага і «Даў слова — стрымай» Алоўнікава. Але ж гэта вельмі мала для святочнага канцэрта. Няма твораў на мясцовыя тэмы, трапных, вясёлых частушак.

Тое ж можна сказаць і пра іншыя калектывы мастацкай самадзейнасці сельскіх клубаў. А чаму б не падрыхтаваць цікавую літаратурна-музычную кампазіцыю аб слаўным шляху нашай краіны, пачынаючы з першых пяцігодак і да сённяшніх дзён. Такую праграму глядач сустрэў бы вельмі прыхільна.

Добрую справу закліканы рабіць зборнікі серыі «Мастацкая самадзейнасць», якія выпускае выдавецтва «Беларусь». Але выпускаюцца яны з разлікам на прафесіянальныя калектывы. А сельскім самадзейным артыстам у зборніках многае недаступна.

Сельскія культработнікі выказваюць пажаданне, каб у такіх зборніках больш змяшчалася песень народнага характару на два галасы з элементамі трохгалосся.

Гэтыя заўвагі правільныя. У нашым раёне толькі два загадчыкі клубаў ведаюць нотную грамату. Таму прасцейшыя творы хутчэй знаходзілі б сабе дарогу на сельскую сцэну. Патрэбен таксама асобны зборнік для аматараў мастацкага чытання.

С. СЯМЁНАЎ,
адказны сакратар Краснапольскай раённай газеты.

НОВЫЯ ПРАГРАМЫ, НОВЫЯ КАЛЕКТЫВЫ

Вялікі наш клопат — забяспечыць самадзейныя калектывы арыгінальным надзённым рэпертуарам. З гэтай мэтай савет Маладзечанскага аддзела культуры разам з рэдакцыяй газеты «Светлы шлях» аб'явілі конкурс на лепшы твор пра партыю, Радзіму, сённяшні і заўтрашні дзень роднага горада, пра нашых сучаснікаў — актыўных будаўнікоў камунізма. Самадзейныя кампазітары, пачынаючыя паэты працуюць над гэтымі тэмамі, і мы спадзяёмся, што рэпертуар самадзейных артыстаў узбагаціцца новымі творамі мясцовых аўтараў.

Каб прыцягнуць увагу самадзейных калектываў да гераічнай тэмы, упершыню правялі агляд харавых калектываў на лепшае выкананне ваенна-патрыятычнай песні. Гэта было надзвычай цікавае свята песні, якое прыцягнула ўвагу хораў, ансамбляў і салістаў.

Штовечар у гарадскім Доме культуры збіраюцца самадзейныя артысты. Новыя праграмы рыхтуюць народны ансамбль песні і танца, народны тэатр і тэатр лялек. У Доме культуры чыгуначнікаў створаны калектыў эстрадна-цыркавога мастацтва, з'явіліся новыя калектывы на мясакамбінаце і ў аўтатранспартнай калоне. І яшчэ адна прыемная навіна — у Маладзечна працуе гарадскі хор хлопчыкаў. Дзеці за лета добра адпачылі ў піянерскіх лагерах. З першых дзён верасня адновяцца рэпетыцыі ў гэтым калектыве.

Старанна рыхтуюцца да першага тура фестывалю харавыя калектывы палітэхнікума, настаўнікаў, народны тэатр мэблевай фабрыкі, а таксама самадзейныя артысты камбіната штучнага футра, хлебазавода, фабрыкі музычных інструментаў, дзіцячай бальніцы. Свае першыя работы пакажа на фестывалі студыя кінааматараў, якая здымае цікавыя сюжэты з жыцця прадпрыемстваў і ўстаноў горада.

Вялікую дапамогу гарадскім калектывам мастацкай самадзейнасці аказваюць музычныя вучылішча і школа. Выкладчыкі наладжваюць на прадпрыемствах лекцыі-канцэрты, якія прапагандуюць музычнае мастацтва. Іх кваліфікаваныя парады памагаюць самадзейным артыстам павышаць сваё майстэрства. Акрамя таго пры музычнай школе на грамадскіх асновах працуюць курсы калгасных баяністаў.

Зроблена нямала. Але наперадзе яшчэ многа клопатаў. Непакоіць нас, у прыватнасці, тое, што некаторыя прадпрыемствы горада не маюць самадзейных гурткоў, напрыклад, камбінат будаўнічых матэрыялаў, піўзавод. Слабыя яшчэ калектывы ў клубе будаўнікоў, друкарні «Перамога», на станказаводзе. Не ўсе самадзейныя артысты забяспечаны касцюмамі.

Зробім усё магчымае, каб першы тур фестывалю самадзейнага мастацтва, які адбудзецца сёлета ў снежні, прайшоў у нашым горадзе, як вялікае свята народных талентаў.

Л. СУРПІН,
загадчык Маладзечанскага гарадскога аддзела культуры.

ЛІТЕРАТУРНАЯ ГАЗЕТА

У 1967 ГОДЗЕ — НА 16 СТАРОНКАХ

Расказвае галоўны рэдактар «Літаратурнай газеты» А. Б. ЧАКОЎСКІ

Дарагія сябры, падпісчыкі і чытачы «Литературной газеты»!

Мне хацелася б падзяліцца навіною, далёка не абыякавай для ўсіх, хто любіць і заўсёды чытае нашу газету.

1 студзеня 1967 года нашы падпісчыкі знойдуць у сваіх паштовых скрынках даволі ёмісты пакунак. Разгарнуўшы яго, яны ўбачаць звыклы загаловак: «Литературная газета». Але сама газета здасца яўна нязвыклай: у ёй будзе 16 старонак вялічага «праўдзінскага» фармату.

Гэтая газета будзе выходзіць штотыднёва, і ўсё ж яна будзе намнога большай за цяперашнюю, бо нават тры нумары, што выходзілі на тыдзень, складалі толькі 12 старонак.

Якою яна будзе, новая штотыднёвая шаснаццацістаронкавая «Литературная газета», і якімі прычынамі абумоўлена яе рэарганізацыя?

Відаць, усе пагодзяцца са мною, што адной са знамянальных прыкмет часу, у які мы жывём, з'яўляецца ўсё ўзрастаючая цяга чытачоў да разнастайных духоўных ведаў. Той стымул свабоднаму творчаму мысленню, які быў дадзены з'ездамі нашай партыі, пачынаючы з XX, гая барацьба супраць касмасці, супраць валюнтарысцкіх, ненавуковых метадаў кіраўніцтва, якая знайшла сваё адлюстраванне на XXIII з'ездзе партыі і на Пленумах ЦК, пачынаючы з кастрычніцкага 1964 г., не прамінулі і не маглі прамінуць бясследна для стану людскіх розумаў.

У небывалай да гэтага часу ступені разбуджана ініцыятыва мас. У розных сферах духоўнай дзейнасці савецкіх людзей праходзіць усё больш актыўнае абмеркаванне найактуальнейшых пытанняў развіцця народнай гаспадаркі, навукі, культуры. Вялікая творчая актыўнасць характэрная і для такіх ідэалагічных галін, як літаратура і мастацтва.

Мы ведаем, што чытачоў цікавяць дыскусіі, палемічныя артыкулы, выступленні, прасякнутыя духам ваяўнічага марксізма, на самыя разнастайныя тэмы нашага ўнутранага і міжнароднага жыцця, а такія галіны духоўнай дзейнасці чалавека, як літаратура, мастацтва, міжнародная палітыка, сацыялогія, народная асвета, права, даўно ўжо прыцягваюць увагу не толькі спецыялістаў.

Вялікія задачы паўстаюць перад работнікамі нашай культуры ў сувязі з ідэалагічнай барацьбой, якая ўсё больш разгараецца на сусветнай арэне.

Ні для кога не сакрэт, што нашы ідэалагічныя праціўнікі, выкарыстоўваючы радыё, кіно, міжнародныя культурныя сувязі, намагаюцца не толькі тэндэнцыйна падаваць розныя факты і праявы ў нашай духоўнай і матэрыяльнай дзейнасці, а і атакаваць асноўныя ідэі, якімі кіруецца ў сваім жыцці савецкі народ. Якраз на старонках нашых газет, і ў першую чаргу прысвечаных непасрэдна праблемам ідэалогіі, нашы чытачы хочуць знайсці ўсе тыя аргументы, якія мы заканамерна супрацьстаўляем варожым вымыслам, бачыць матэрыялы, якія сцвярджаюць вялікія перавагі савецкага ладу жыцця, выкрываюць ідэалогію свету, асуджанага гісторыяй.

Чытаючы «Литературную газету», вы зможаце быць у курсе таго, што адбываецца ў савецкай літаратуры, пазнаёміцца з рознымі думкамі пра надзённыя праблемы літаратуры і мастацтва, першымі даведацца пра новыя, толькі што напісаныя і нават яшчэ незакончаныя творы празаікаў, паэтаў, драматургаў і крытыкаў. Вы зможаце першымі прачытаць шмат якія з гэтых твораў або ўрыўкі з іх, вы будзеце першымі праінфармаваны пра тое, якія кніжкі з'явяцца на паліцах кнігарань у бліжэйшы час, якія фільмы выйдуць на экраны — на вялікія экраны і на тэлевізійныя. Мы пераконаны, што вас, напэўна, цікавяць выказванні пісьменнікаў, вучоных, грамадскіх дзеячоў у сувязі з эканамічнай рэформай у нашай краіне, з праблемамі народнай асветы, з пытаннямі аховы прыроды, праблемамі маралі, этыкі, права, быту, з апошнімі навуковымі адкрыццямі, ну, ды і з усімі іншымі бакамі духоўнага, грамадскага, працоўнага жыцця савецкага чалавека.

«Литературная газета» заўсёды аддавала вялікую ўвагу становішчу ў сучасным свеце, найнавейшым палітычным, сацыялагічным, філасофскім тэорыям, якія з'яўляюцца за мяжой, палеміцы з нашымі ідэалагічнымі праціўнікамі. Усяму гэтаму мы збіраемся ўдзяліць значна больш месца ў нашай газеце.

У новай газеце вы зможаце самі непасрэдна прыняць удзел у дыскусіях і абмеркаваннях, якія будуць весціся на яе старонках, выказаць свой пункт гледжання ў якой-небудзь з хвалюючых вас тэм. «Литературная газета» аддасць значна больш месца, чым да гэтага часу, пісьмам і водгукам чытачоў. Гэта будзе спецыяльны новы вялікі раздзел газеты.

Ну, і звычайна, сябры, вы любіце пасмяяцца. У новай газеце востры фельетон, літаратурныя пародыі, эпіграмы, сяброўскія шаржы будуць змяшчацца ў кожным нумары.

Да хуткай сустрэчы ў новым, 1967 годзе!

Вялікая прасторная зала, прыгожыя светлыя вітрыны, багаты выбар літаратуры — так выглядае полацкі кніжны магазін «Светач», калектыў якога ў поўным сэнсе гэтага слова нясе людзям святло ведаў, культуры.

Полацкая кнігарня — адна з лепшых у рэспубліцы. На працягу многіх год яна з месяца ў месяц выконвае планы продажу кніг насельніцтву. Сёлета, напрыклад, за восем месяцаў рэалізавана літаратуры на 130 тысяч рублёў, што складае 118 працэнтаў плана.

У магазіне працуюць дванаццаць прадаўцоў — добрых знаўцаў кнігі. Ведаюць пакупнікі Галіну Мацвееву з аддзела мастацкай літаратуры, Лілію Марозаву, якая працуе ў аддзеле вучэбна-педагагічнай кнігі... А вось Ала Цябут прыйшла ў магазін дванаццаць год назад, адразу пасля заканчэння сярэдняй школы. Цяпер Ала Іванаўна адна з вопытнейшых прапагандыстаў кнігі. Яна працуе ў аддзеле грамадска-палітычнай літаратуры і падпісных выданняў, адначасова вядзе аддзел «Кніга — поштай». Наладжаны трывалыя сувязі з прадпрыемствамі, установамі. Яе званка ці паштоўкі заўсёды чакаюць многія кнігалюбы, бо гэта будзе паведамленне: «У магазін паступіла заказаная вамі кніга».

Сустрэча з кнігай заўсёды нясе чалавеку радасць, натхненне. А такіх сустрэч у Алы Іванаўны многа. Вопытны кнігалюб умее цікава расказваць пра навінку, умее параіць яе чытачу.

На здымку: Ала ЦЯБУТ знаёміцца з новымі кнігамі.

Фота С. АНАНКІ.

КВАДРАТУРА КРУГА

М. ЗАМСКІ, спец. кар. «Літаратуры і мастацтва»

У КОЖНАГА чалавека ёсць свая першая прачытаная кніга. І колькі б потым ён ні прайшоў дарог у свеце літаратуры, гэтая першая кніжка ў яго памяці заўсёды будзе стаяць асобна.

У мяне такая кніжка — «Салавей» Зм. Бядулі. Многа год сплыло з таго дня, калі я, першакласнік, дрыжачымі рукамі ўзяў яе ў бібліятэцы. А жыве гэта ў памяці, быццам было ўчора. Памятаю, якая была вокладка кніжкі, малюнкі, нават твар бібліятэкаркі... Памятаю, як асцярожна, каб не запэцкаць, нёс кніжку дадому, як пачаў уголас чытаць... І ўжо не мог адарвацца, і ўжо жыў іншым светам, перажываў і радаваўся за іншых, дагэтуль мной не бачаных людзей. І можа з таго дня і засталося на ўсё жыццё нейкае, можа крыху і наіўнае стаўленне да Кнігі, як да цуда, вялікага цуда...

Урэшце, усё гэта перажываў, відаць, кожны. І калі я ўспомніў усё гэта, дык была на тое прычына. Нядаўна я зноў сустрэўся са сваёй першай кніжкай, але сустрэча гэтая адгукнулася болем у сэрцы.

Але ўсё па парадку. У Мазыры, на чыгуначнай станцыі, невядома з якіх часоў стаіць цагляны пакгауз. Звычайны пакгауз. І звонку, і ў сярэдзіне пакрыты паравозным курдымам, які, здаецца, уеўся ў цэглу, у драўляныя перакрыцці, у цэментовую падлогу. У такім памяшканні можна хаваць цвікі, запасныя часткі, утыль. Але тут ужо вось паўтара дзесятка год ляжаць кнігі.

У адной з баковак гэтыя кнігі навалены пад самую столь. Я падышоў да гэтага кургана кніжак і выцягнуў першую, што папалася. Узнялося воблака чорнага пылу. У руках быў «Салавей» Зм. Бядулі. Пасляваеннае выданне. У цвёрдай вокладцы, крыху папсаванай вільгаццю, з добрымі малюнкамі.

Я выцягнуў з «кургана» яшчэ некалькі кніжак. «Рыжык» Свірскага, Маршак, Гайдар, Касіль... З гэтага боку, відаць, ляжала дзіцячая літаратура. Адышоў далей. Мерыме, Мапасан, Ганчароў, Тургенеў. Папулярныя выданні ў мяккай вокладцы. Памятаю, мы, студэнты, іх ахвотна раскуплялі...

Дзверы бакоўкі выходзяць у «залу». На падлозе тут раскіданы кучы кніг, на якіх, забраўшыся з нагамі, сядзяць жанчыны. Узмах рукі — кніжка ляціць налева. Узмах — направа.

Цікаўлюся ў загадчыка кніжнай базы (так называецца пакгауз) — пажылога мужчыны з даўно няголеным тварам: які лёс чакае кнігі, што паляцелі налева, а які — што направа.

— Што налева — на спісанне, што направа — загадана пакуль што не чапаць. Відаць, пойдзе на ўцэнку.

Я слухаю яго і думаю пра тое, што, бачыш, слова якое бяскрыўднае прыдумана — «спісанне». А кнігі проста пойдуць пад нож, на макулатуру. Паднімаю з падлогі некалькі такіх кніжак. Купала, Колас, Чорны, Бядуля, Брыль, Мележ, Аўрамчык...

Загадчык, заўважыўшы маё вялікае здзіўленне, крыўдзіцца:

— Што я — сам прыдумаў? Ёсць спецыяльны спіс, зацверджаны Камітэтам па друку. Магу паказаць.

Перагортваю тоўстую кніжку з пералікам твораў, што падлягаюць спісанню. Я. Купала — пяцітомны збор твораў, Я. Брыль — «У Забалоцці днее» і «Вераснёвая рунь», І. Мележ — «Мінскі напрамак» і п'еса «Пакуль мы маладыя», М. Аўрамчык — «Дружба» і г. д. І г. д. Кніжкі выданняў 1949—1951 гадоў. Але ж усё гэта выдавалася і пазней, і неаднаразова.

Праз некалькі дзён я зайшоў у Мінску ў Камітэт па друку пры Савеце Міністраў БССР. Прыняў мяне Анатоль Фаміч Барушка, намеснік старшыні камітэта, начальнік галоўвыдата.

— Чым мы кіруемся, калі загадваем спісваць тую ці іншую кніжку? Па-першае, яе маральным зносам, па-другое — фізічным, калі можна так сказаць...

— У Купалы маральны знос?

— Не, вядома, але ёсць у яго некалькі вершаў, якія прадыктаваны часам культу асобы.

Не будзем наіўнымі, ёсць сапраўды літаратура, якую трэба спісваць — у свой час было выпушчана нямала кніжак-аднадзёнак. Сёння яны не маюць ніякай цікавасці, ніякай каштоўнасці. Іх сапраўды трэба спісваць, пускаць на макулатуру. Але калі з-за двух-трох, хай пяці-шасці вершаў пускаецца пад нож пяцітомнае выданне — гэта, даруйце, проста марнатраўства. Калі з-за аднаго прозвішча, з-за назвы друкарні, у якой друкавалася тая ці іншая рэч, спісваецца ўся кніга — гэта, даруйце, проста глупства. Відаць, вірус перастрахоўкі, ой, яшчэ які жывучы.

Я кажу пра гэта Анатолю Фамічу, і ён, паціснуўшы плячыма, прызнаецца, што, сапраўды, там-сям перагнулі палку.

— Мы далі каманду пяцітомнік Купалы старога выдання больш не спісваць.

Пра тое, колькі кніжак гэтага выдання знішчылі да з'яўлення запозненай каманды, тав. Барушка, вядома, змоўчвае.

— Ну, а спісанне з прычыны страты таварнага выгляду?..

— Тут намі дадзена строгае ўказанне пускаць у макулатуру толькі тыя кнігі, якія страцілі таварны выгляд на 90—95 працэнтаў.

Як кажуць, гэтыя б словы ды богу ў вушы... У тым жа Мазыры летась на кніжнай базе райспажыўсаюза толькі з-за таго, што крыху былі пацёртыя вокладкі, пайшлі ў макулатуру творы Някрасава, Горкага, Райніса, Коласа, Труса і многіх іншых аўтараў — усяго на 19 тысяч рублёў. Пра гэта напісала Мазырская раённая газета, але было позна ўжо — літаратуру паспелі знішчыць, а часткова расцягнуць па хатах.

Але вернемся ў пакгауз. Гэтая кніжная база (ці, правільней, кніжныя могілкі) належыць Гомельскаму аблкнігагандлю. 90—95 працэнтаў страты таварнага выгляду... Хто тут на гэта глядзіць? Загадчык А. Кашкоў, пра якога мы ўжо расказвалі?

— Гэты Пушкін, — кажа ён, паддаўшы нагой кніжку, — састарэў, яго трэба пад нож.

— А якая ў вас адукацыя? — цікаўлюся.

— Я, прызнацца, малапісьменны, але з кнігамі працую даўно, загадваю базай з 1954 года.

Бедныя кнігі!

— У маі здалі макулатуры 7 тон, — загінае загадчык палец, — у чэрвені — 6 тон, у ліпені — 6,5, у жніўні — 7 тон...

Паступаюць сігналы аб знішчэнні старых выданняў класікаў рускай і беларускай літаратуры з Магілёва, Маладзечна, Мінска, раённых цэнтраў. У Чэрвені, напрыклад, спісалі зусім цэлыя, не папсаваныя кнігі Льва Талстога.

Я, вядома, не хачу сказаць, што тав. Барушка сказаў мне няпраўду. Не, камітэт сапраўды выдаў у апошні час некалькі загадаў, інструкцый і цыркуляраў, накіраваных на тое, каб палепшыць кніжны гандаль, каб ліквідаваць завалы на кніжных базах. Але, зноў-такі, як кажуць, добрымі намерамі вымашчана дарога ў пекла.

Трэба ж яшчэ неяк кантраляваць выкананне гэтых цыркуляраў. Бо атрымліваецца ж так — загадана ачысціць кніжныя склады? Ну, і пайшло. Чысціць дык чысціць. Хто хутчэй, хто чысцей. І тысячы карысных кніг ідуць пад нож. Пра гэта балюча пісаць, але з песні слова не выкінеш...

Самае небяспечнае, што пад масавае спісанне літаратуры, спісанне без разбору там-сям імкнуцца падвесці нават нейкую тэарэтычную базу. Асноўны аргумент прыхільнікаў ператварэння кніжак у макулатуру — быццам гэтыя выданні не маюць попыту ў чытача. Гэта не маюць попыту Талстой, Бальзак, Горкі, Купала!

У Мазырскім кніжным магазіне Гомельскага аблкнігагандлю не знойдзеш твораў ні Горкага, ні Купрына, ні Коласа.

— Увесь час пытаюцца ў нас пра «Новую зямлю» і «На ростанях» Коласа, — прызнаецца дырэктар магазіна М. Шляга. — Але заяўкі нашы не задавальняюцца.

— А вы зайдзіце ў пакгауз, можа там знойдзеце, — параіў я.

— Калі там і ёсць, дык папсаваныя. А мы гандлюем новай кнігай...

— Дык уцаніце.

— О, гэта вельмі складаная справа...

Прыблізна такая ж размова адбылася і на абласной кніжнай базе ў Гомелі, куды перавозяць частку літаратуры з Мазыра.

— Ну і куды яе? — пытаецца загадчыца склада В. Кабакова. — Магазіны ж гэтых кніг не возьмуць.

— Раздаць бібліятэкам, — наіўна прапаную я.

— На гэта патрэбна адпаведнае ўказанне. Ці з балансу на баланс, ці за грошы? Гэта павінна рэспубліканскае начальства вырашыць...

— Наўрад ці мэтазгодна перадаваць у бібліятэкі літаратуру, — гаворыць тав. Барушка.

— ?

— Не здзіўляйцеся. Уявіце сабе такое. У сельскую бібліятэку перадалі некалькі сот экземпляраў кніг, што страцілі таварны выгляд. Бясплатна перадалі. Як узяць іх на баланс? Проста абазначыць колькасць? Дык тут адкрываецца мноства шляхоў для злоўжыванняў.

— Толькі па гэтай прычыне нельга перадаць бібліятэкам?

— А хіба гэтага мала?

А кніг на вёсцы сапраўды яшчэ мала, ой як мала. На Мазыршчыне я пабываў у некалькіх сельскіх і школьных бібліятэках, у сельмагах, дзе прадаюць кнігі. Вось Слабадская сельская бібліятэка. Сумнае відовішча. Беларускіх аўтараў тут адзін-два. І рускіх класікаў — на пальцах пералічыш.

Побач сельмаг. На вузенькай паліцы — паўтара дзесятка кніжак. Побач з кірзавымі ботамі і селядцамі.

— Купляюць кніжкі? — цікаўлюся ў загадчыка магазіна М. Сітніка.

— Мала. Раней вучні ўсё прыходзілі ды прасілі «Яўгенія Анегіна» (загадчык вымавіў назву крышку інакш, але я зразумеў), «Маладую гвардыю», байкі Крапівы, а дзе я ім вазьму?

— Як укамплектавана кнігамі наша бібліятэка? — дырэктар Слабадской сярэдняй школы (адной з самых вялікіх у раёне) Ф. Турскі ў роспачы махае рукой. — Дрэнна, вельмі дрэнна. Асабліва не хапае мастацкай літаратуры па школьнай праграме. «Яўгенія Анегіна» толькі два экземпляры. На два восьмыя класы, дзе праходзяць гэты твор. Шэкспіра ў нас адзін том, і то ледзь дасталі. Горкага — два тамы...

Я расказваю дырэктару, што ў Мазырскім пакгаузе навалам ляжаць кнігі гэтых аўтараў. Не верыць...

Прыблізна такая ж размова адбылася ў Скрыгалаўскай і Прудоцкай сярэдніх школах, дзе бібліятэкі ўкамплектаваны яшчэ горш.

Атрымліваецца дзіўная сітуацыя. Ёсць кнігі, ёсць людзі, якія жадаюць іх набыць, і, між тым, гэтыя кнігі і гэтыя людзі не могуць знайсці адзін аднаго.

Мне здаецца, што ўсё гэта невыпадкова. Усё гэта вынік ненармальных парадкаў, якія ў нас існуюць у гандлі кнігай. Прывяду такі прыклад. На кніжнай базе Мазырскага райспажыўсаюза амаль няма кніг беларускіх пісьменнікаў. Ды і іншай літаратуры як кот наплакаў. Я параіў работнікам базы зазірнуць у славуты пакгауз.

— Дык гэта ж не наша ведамства, — у адзін голас усклікнулі работнікі базы. — Там дзяржаўны гандаль, а мы — кааператыўны.

Мне прыйшлося пачырванець. Забыўся пра такую рэч. Але ў той жа момант падумалася, а на якое ліха патрэбен такі падзел? Чаму гандляваць кнігай павінны два гаспадары? Прычым для аднаго з іх — гандаль кнігай асноўны занятак, для другога — другарадны. Калі ўзяць у цэлым па рэспубліцы, дык у сістэме спажывецкай кааперацыі кніга ў агульным таваразвароце займае ўсяго 0,44 працэнта.

Вы думаеце, загадчык Слабадскога сельмага М. Сітнік, пра якога я ўпамінаў вышэй, зацікаўлены ў продажы кніг? Яму гэта ўсё роўна. На выкананне плана, на прагрэсіўку кніжкі ніякага ўплыву не маюць. Гэта не боты, не гарэлка і не селядцы. Што з кнігамі, што без іх. І Сітніку нават у галаву не прыйдзе, каб прапагандаваць літаратуру, арганізоўваць выстаўкі, насіць кнігі па хатах.

Відаць, нездарма ў рэспубліках Прыбалтыкі, у Малдавіі даўно адмовіліся ад такога падзелу гандлю кнігай. Там гэтая справа ў адных руках — у руках людзей, якія займаюцца толькі кнігай.

Ёсць і яшчэ нямала перашкод, што стаяць на шляху кнігі да чытача. Кіраўнікі школ, з якімі мне давялося сустрэцца, у адзін голас скардзіліся на нядаўнюю сумесную пастанову Міністэрства асветы рэспублікі і Камітэта па друку, згодна з якой камплектаванне школьных бібліятэк праводзіцца толькі праз абласныя бібкалектары.

— Раней, бывала, убачыш у кнігарні добры твор, патрэбны для школы, і адразу купіш. А да сёраваздачы табе выпішуць у магазіне рахунак, — расказвае дырэктар Слабадской школы Ф. Турскі. — А цяпер чакай, што табе прышлюць з бібкалектара. Мы аднойчы ўжо мелі справу з ім. Заказалі адно, а прыслалі зусім іншае. Але тады мы добраахвотна звязаліся з бібкалектарам, а цяпер рабіць гэта нас прымушаюць.

Цікавы аргумент мне давялося пачуць у карысць гэтай пастановы ад тав. Барушкі.

— Звычайна загадвае школьнай бібліятэкай жонка дырэктара школы або якая-небудзь настаўніца. І набываецца літаратура патрэбная ў асноўным толькі загадчыцы, — замежная, прыгодніцкая і г. д. Вось чаму многія школьныя бібліятэкі бедныя на праграмную літаратуру. Цяпер становішча будзе выпраўлена...

Што і казаць, жалезная логіка. Але што рабіць, калі «жонка дырэктара» пры складанні заявак у бібкалектар зноў улічыць толькі свой асабісты густ?

...Добрая кніга — згустак чалавечай думкі, чалавечага розуму. Добрая кніга — жыве заўсёды. Але каштоўнасць яе вымяраецца не толькі зместам, каштоўнасць кнігі вымяраецца і колькасцю людзей, якія змаглі напіцца з гэтай чыстай крыніцы. А гэта ўжо залежыць не ад пісьменніка, а ад людзей, якім даручана ганаровая справа — быць прапагандыстамі кнігі.

Мазыр — Гомель — Мінск.

НОВЫ ЦЭНТР ТЭХНІЧНАЙ ЭСТЭТЫКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Усе астатнія як навуковыя, так і праектныя распрацоўкі інстытут будзе весці на дагаворных асновах. Сюды ўвойдуць прапановы і рэкамендацыі па комплекснаму абсталяванню прамысловых інтэр'ераў беларускіх заводаў і фабрык, уключаючы арганізацыю рабочых месц і аргтэхаснастку. Мы будзем заключаць дагаворы на мастацка-канструктарскія распрацоўкі многіх прамысловых вырабаў, што выпускаюцца ў рэспубліцы, — прадукцыі машынабудавання, станкабудавання і прыборабудавання, прадметаў культурна-бытавога прызначэння, уключаючы матацыклы, веласіпеды, радыё- і фотаапаратуру, гадзіннікі, бытавыя прыборы, посуд і г. д. Да гэтых відаў работ адносіцца і прамысловая графіка — мастацка-канструктарская распрацоўка гандлёвай рэкламы, упакоўкі, этыкетак, таварных знакаў, ярлыкоў, праспектаў фірменных бланкаў для адміністрацыйнай дакументацыі.

Дарэчы сказаць, хоць інстытут толькі арганізаваўся, мы ўжо атрымалі сотні заказаў на падобныя работы. Частка іх ужо выконваецца. Нашы мастакі-канструктары праектуюць, напрыклад, металічны эмаліраваны посуд, свяцільнікі, упакоўку.

— Хацелася б удакладніць, як будуць спалучацца навукова-даследчыя і канкрэтныя праектныя распрацоўкі і як гэта адабяецца на арганізацыйнай структуры інстытута.

— Структура інстытута такая. Навукова-даследчыя распрацоўкі, абагульненне вопыту, вывучэнне інфармацыі і яе апрацоўку, падрыхтоўку да выдання навуковых прац будзе весці навукова-даследчы аддзел. У ім з часам разаўюцца самастойныя сектары, у якіх будуць працаваць вучоныя розных спецыяльнасцей — філосафы, сацыёлагі, эканамісты, мастацтвазнаўцы, псіхолагі, фізіёлагі, гігіеністы, прадстаўнікі тэхнічных навук, а таксама эксперты па кібернетыцы, біёніцы, розных метадах мадэлявання і матэматычных даследаванняў. Аддзелу тэорыі будуць прыдадзены служба інфармацыі, перакладаў, патэнтнае бюро, выдавецтва.

Само сабою зразумела, што нашы тэарэтыкі будуць звязаны з мастацка-канструктарскімі аддзеламі, кожны з якіх займецца сваім профілем. Тут будуць працаваць мастакі-канструктары, архітэктары, інжынеры-канструктары і тэхнолагі. Апрача таго, у інстытуце будуць эксперыментальныя і навукова-даследчыя лабараторыі. Любая распрацоўка, такім чынам, атрымае сваё выражэнне не толькі ў тэарэтычных выкладках, рэкамендацыях і метадычных указаннях, але і ў канкрэтных эксперыментальных праектах, узорах вырабаў. Для гэтага мы будзем мець «вытворчы сектар» — макетную, сталярную і механічную майстэрні.

— Відаць, адной са складаных праблем з'яўляецца праблема кадраў? Як вядома, спецыялістаў патрэбных напрамкаў пакуль што нашы навучальныя ўстановы амаль не рыхтуюць.

— З гэтай праблемай мы сутыкнуліся ў першую чаргу. Высокакваліфікаваных і таленавітых спецыялістаў шырокага профілю, якія б адначасова разбіраліся ў пытаннях эстэтыкі, на жаль, нямнога. Вось тут і даводзіцца збіраць плён вузкай спецыялізацыі, якая характэрна для падрыхтоўкі нашых кадраў. Асабліва мала ў нас мастакоў-канструктараў. У рэспубліцы іх ніхто ніколі не рыхтаваў, а на ўсю краіну да апошняга часу існавалі толькі два інстытуты мастацка-канструктарскага профілю.

— Якое ж выйсце?

— Па-першае, у бліжэйшы час неабходныя кадры пачне выпускаць наш беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Тут рыхтуюць інтэр'ершчыкаў, мастакоў па прамысловым формаўтварэнні, прамысловых графікаў. Сярэдняе звяно спецыялістаў гэтага профілю дадуць нам мастацкія вучылішчы. Але гэта ў будучым. А пакуль што адбіраем лепшых спецыялістаў з сумежных галін, якія па роду сваёй дзейнасці сутыкаліся з мастацкім канструяваннем, — архітэктараў, мастакоў-прыкладнікоў, мастакоў — прамысловых графікаў.

Асобныя патрабаванні ставім і да інжынераў. Гэта павінны быць шырока адукаваныя людзі з добрым мастацкім густам, здольныя працаваць у кантакце з мастакамі.

Дэфіцытнымі з'яўляюцца і многія тэарэтычныя спецыяльнасці, асабліва эрганоміка, тэхнічная эстэтыка.

Мы ўжо сёння старанна шукаем патрэбныя нам кадры. Не выключана, што давядзецца запрашаць іншагародніх спецыялістаў, заняцца падрыхтоўкай і перакваліфікацыяй сваіх.

— І апошняе пытанне. Вы гаварылі, што інстытут будуе свой дом. Што гэта будзе за дом?

— Па ідэі гэта павінен быць першы ў краіне спецыялізаваны будынак для навукова-даследчага інстытута падобнага профілю — з самым сучасным абсталяваннем. Такая задача пастаўлена перад яго праекціроўшчыкамі — архітэктарамі «Мінскпраекта». Як ён будзе выглядаць? Шматлікія службовыя памяшканні размесцяцца на сямі паверхах шкляного паралелепіпеда — навуковыя лабараторыі, кабінеты, праектныя майстэрні, канферэнц-зала. Цокаль займуць дапаможныя памяшканні, вытворчыя майстэрні, а на першым паверсе мяркуецца абсталяваць вялікую выставачную залу з экспазіцыйнай плошчай у тысячу квадратных метраў. Тут можна будзе праводзіць не толькі мясцовыя, але і ўсесаюзныя і міжнародныя выстаўкі і сімпозіумы.

У МАЙСТЭРНЯХ МАСТАКОЎ

ПРЫХОДЗІЦЬ СТАЛАСЦЬ

Мікалай Палянкоў за работай.

Фота Ул. ПРАТАПОПАВА.

На мастацкіх выстаўках гомельскі жывапісец Мікалай Палянкоў спачатку выступіў як пейзажыст. Гледачы ўбачылі яго работы: «Люты», «Веснавы разліў», «Цішыня», «Восень». У гэтых невялікіх па памеры пейзажных кампазіцыях мастак з любоўю занатаваў маляўнічыя куткі родных мясцін.

І ўсё ж у гэтых работах не было галоўнага — завершанасці і абагульнення, не было цэльнага вобраза прыроды. Адчувалася, што мастак у поўнай меры яшчэ не здольны бачыць колер, перадаваць натуру. Адсюль — недастатковыя характарыстыкі прыроды, прыглушаны, вялы каларыт.

Мікалай Палянкоў разумеў, што, каб стаць добрым мастаком, трэба яшчэ шмат працаваць над сабой, часцей бываць на эцюдах, выхоўваць у сабе пачуццё прыгажосці прыроды, колеру.

— Больш, як мага больш вывучаць прыроду, натуру, паглыбляцца ў яе, — казалі мастаку калегі, настаўнікі.

З цягам часу прыйшло ўласнае бачанне натуры, колеру. Мікалай Палянкоў навучыўся кожны раз нанова адчуваць колер, у залежнасці ад стану прыроды бачыць колерныя адносіны, непаўторныя па сваёй гармоніі.

Я таму так падрабязна кажу пра гэта, бо ў апошніх работах, і асабліва ў карціне «У час адпачынку», для Мікалая Палянкова колер стаў адным з галоўных сродкаў выяўлення тэматычнай і ідэйнай накіраванасці твораў.

Цяпер Мікалай Палянкоў навучыўся «дыхаць» колерам. Ён свае творы «завязвае» на тонкай гармоніі адценняў («Май», «Бярозы»).

Бадай, найбольш значная ў мастака карціна «У час адпачынку». Яна проста, смела і цікава закампанавана, удалая па колернаму вырашэнню.

Тры салдаты выбіраюць кнігі ў кіёску. Вось і ўвесь «сюжэт». Але паглядзіце, колькі маладой заўзятасці, колькі мэтанакіраванасці ў абліччах воінаў, колькі чысціні, прыўзнятасці.

Выразны рытм каляровых плям, вырашаных у цёплай барвова-аранжавай гаме, не толькі арганізуе каларыстычны лад карціны, але і вызначае галоўную накіраванасць палатна, якое сцвярджае прыгажосць чалавека і прыроды.

Пэўная нязвыкласць мазка не замінае характарыстыцы вобразаў, як гэта іншы раз здараецца, калі мастак спрабуе пісаць кідка, з разлікам на знешні эфект. У Мікалая Палянкова манера жывапісу падпарадкавана выяўленню задумы.

У апошні час намеціўся прынцыповы паварот у творчасці Мікалая Палянкова — ён перайшоў да работы над вялікімі, шырокімі тэмамі, хаця паранейшаму не пакідае пісаць пейзажы.

Да 50-годдзя Савецкай дзяржавы і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна мастак працуе над двума палотнамі. Адно з іх — «Пара экзаменаў» — пра наша маладое пакаленне, пра яго мары, імкненні. Другое сваё палатно Мікалай Палянкоў назваў «Ленін і Афрыка». Гэта пакуль што ўмоўная назва. Напісаны эцюды афрыканцаў — студэнтаў універсітэта імя Патрыса Лумумбы, вядуцца кампазіцыйныя пошукі.

Мікалай Палянкоў — удумлівы, сур'ёзны і сціплы творца. Майстэрства яго развіваецца, удасканальваецца.

А. ШНЫПАРКОЎ.

Гомель.

ВОДГУКІ, АДКАЗЫ

ПОПЫТ БУДЗЕ ЗАДАВОЛЕНЫ

16 жніўня ў газеце «Літаратура і мастацтва» быў надрукаваны артыкул «Давайце пачытаем разам...», у якім ішла гаворка аб сур'ёзных упушчэннях у выданні і распаўсюджванні твораў беларускіх пісьменнікаў на роднай мове. Артыкул абмяркоўваўся ў Камітэце па друку пры Савеце Міністраў БССР.

Рэдакцыя атрымала адказ за подпісам старшыні Камітэта тав. Канавалава. Вось што ён піша:

«Начальніку Упраўлення кніжнага гандлю т. Патупчыку дадзена ўказанне карэнным чынам палепшыць работу па зборы заказаў на кнігі беларускіх пісьменнікаў на роднай мове.

Прыняты меры па паляпшэнню работы з падпіснымі выданнямі. Мінскі магазін падпісных выданняў ператвораны ў рэспубліканскі, яму даручана каардынацыя ўсёй работы па распаўсюджванню падпісных выданняў у рэспубліцы.

Работнікі Камітэта па друку прынялі ўдзел у нарадзе начальнікаў і таваразнаўцаў абласных аддзелаў кнігі Белкаапсаюза, на якой былі намечаны меры па актывізацыі прапаганды і распаўсюджвання беларускіх кніг у сельскай мясцовасці.

Камітэт па друку пры Савеце Міністраў БССР пасля кансультацый з адпаведнымі ўстановамі і арганізацыямі, у тым ліку з Саюзам пісьменнікаў БССР, распрацаваў перспектыўны план перавыдання лепшых твораў беларускай літаратуры ў 1966—70 гадах. Ажыццяўленне гэтага плана дасць магчымасць больш поўна задаволіць попыт насельніцтва рэспублікі на лепшыя творы беларускай літаратуры».

Ігнату Дуброўскаму—60 гадоў



4 верасня спаўняецца 60 год Ігнату Дуброўскаму. Праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі звярнулася да юбіляра з прывітаннем, у якім гаворыцца:

«Дарагі Ігнат Цімафеевіч!

Сардэчнае прывітанне Вам, нашаму таварышу па літаратурнай працы, у дзень Вашага 60-годдзя.

Вы прыйшлі ў літаратуру ў пасляваенны час, маючы ўжо значны жыццёвы вопыт, запас назіранняў і ўражанняў. Асабліва знаёмыя і блізкія Вам, спецыялісту сельскай гаспадаркі, справы калгаснай вёскі. Вашы творы — апавяданні, аповесці, нарысы, прысвечаныя працаўнікам вёскі, — вызначаюцца добрым веданнем жыцця, глыбінёй пранікнення ў сутнасць з'яў, у духоўны свет чалавека.

Сваёй творчасцю Вы змагаецеся за перамогу добрага, светлага ў нашым жыцці, за чалавека вялікай душы, крыштальнага сумлення, за пабудову камуністычнага грамадства.

Нельга не адзначыць таксама і Вашай плённай працы ў якасці навуковага супрацоўніка Інстытута эканомікі Акадэміі навук БССР.

Ад усяго сэрца жадаем Вам, дарагі Ігнат Цімафеевіч, здароўя, доўгіх год жыцця, новых поспехаў у літаратурнай і навуковай творчасці, шмат радасці ў жыцці».

Рэдакцыя «Літаратуры і мастацтва» далучаецца да віншавання і жадае юбіляру поспехаў і шчасця.

УЛЮБЁНЫ Ў ЧАЛАВЕКА ПРАЦЫ

Агульнапрызнана, што нарыс у нашай літаратуры, асабліва ў беларускай, самы занядбаны жанр. Ён не вельмі каб карыстаўся ўвагай крытыкі, хоць чытачы чакаюць баявых, вострапубліцыстычных, праблемных выступленняў пісьменнікаў на старонках нашых газет і часопісаў. Працаваць у такім жанры—своеасаблівы подзвіг, бо пра што б ні пісаў аўтар нарыса—ён павінен пракладаць першую баразну. Шмат барознаў наараў на літаратурнай ніве Ігнат Дуброўскі—аўтар такіх прыкметных здабыткаў у галіне мастацкага нарыса, як «Светлы шлях», «Над Сожам», «Зямныя вузлы».

Што характэрна для Ігната Дуброўскага, дык гэта ўлюбёнасць у чалавека працы, працы на зямлі. Вёска з яе заўсёднымі трывогамі і турботамі—вось той фокус, у якім пісьменнік канцэнтруе сваю творчую ўвагу, куды накіроўвае ён сваё натхненне. Вёска цікавіць Ігната Дуброўскага не толькі ў традыцыйным плане—як месца, дзе чалавек здзяйсняе самыя блізкія кантакты з прыродай, размаўляе з ёй на «ты», а і ў плане творчых пошукаў—як месца, дзе найбольш ярка выяўляюцца рэвалюцыйныя пераўтварэнні эканамічнага, сацыяльнага, маральнага ўкладу жыцця, дзе ўвесь час ідзе працэс няспыннага ўдасканалення, дзе жыццё відаць у яснай перспектыве свайго няспыннага росту. Бачыць вёску іменна такой—у заўсёдным руху наперад—памагае Ігнату Дуброўскаму не толькі багаты жыццёвы вопыт (час адмераў чалавеку добрую капу гадоў!), а і грунтоўныя веды ў выбранай ім сферы навукі—аграрнай. Ён земляроб не толькі па паходжанню, але і па набытай прафесіі вучонага-эканаміста.

Ігнат Цімохавіч Чарняўскі—гэтак яго ведаюць у колах сельскагаспадарчай навукі і практыкі—і Ігнат Дуброўскі—гэтым літаратурным імем ён падпісвае свае мастацкія творы—адзін і той жа чалавек. Для мяне ён яшчэ і зямляк. Лёс вылучыў нам адно месца нараджэння—вёску Дуброва, што кіламетраў за дваццаць ад Мінска, каля Астрашыцкага Гарадка. Ігнат вучыўся ў майго бацькі, скончыў чатыры класы пачатковай школы, атрымаў той адукацыйны цэнз, які быў па тым часе—у першыя гады станаўлення Савецкай улады—даволі трывалым грунтам, каб ладзіць самастойна сваё жыццё.

А Ігнату ў трынаццаць гадоў давялося быць ужо сталым. Спачатку памерла ад тыфу маці, а ўлетку 1919 года белапалякі бязлітасна расправіліся і з Ігнатавым бацькам—расстралялі яго на вачах у дзяцей як савецкага актывіста, члена валаснога рэвалюцыйнага камітэта.

Ігнат Чарняўскі быў настырным і бясстрашным камсамольцам, які не зважаў на пагрозы няўцямных старых, змагаўся з цемрай на вёсцы, арганізоўваў сельскую моладзь на барацьбу з усім, што замінала прыходу новай, светлай явы сацыялістычнага ладу.

Мы чыталі ў «Беларускай вёсцы» баявыя допісы і нават вершы. Чыталі і не верылі, што гэта пісаў той самы Ігнат з Дубровы. А Ігнат тым часам здабываў сабе шлях у сапраўдную навуку—вучыўся ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, потым аспірантам у Маскве і ў трыццацігадовым узросце стаў кандыдатам сельскагаспадарчых навук.

А жыццё рыхтавала для ўсіх нас найцяжэйшае выпрабаванне — выпрабаванне агнём. Ігнат Чарняўскі ў аўтабіяграфіі шчыра прызнаецца: «Не толькі намеры і планы, але ўсё жыццё пераблытала вайна... Удзельнічаў у баях пад Масквой у якасці камандзіра артылерыйскай батарэі. Давёўся мне цяжкі вайсковы лёс. У стане ранення і кантузіі я быў захоплен фашыстамі ў палон і зведаў усе жахі канцлагера. З усяго перажытага там зноў жа ў мяне светлыя ўспаміны пакінулі людзі».

Людзі. Імі быў захоплены Ігнат з маленства, ім аддае ўсе свае сілы і веды, свой вопыт Ігнат Цімохавіч у сталыя гады. Дарэчы, калі чытаеш у кнізе «Пра час і пра сябе» аўтабіяграфію Ігната Дуброўскага, дык лішні раз пераконваешся ў вялікай сціпласці гэтага чалавека. Менш за ўсё напісаў ён пра сябе, а больш пра час і пра людзей, чый прыклад служыў яму светлай паходняй на самых складаных паваротках жыццёвай дарогі.

Людзі і сёння ў цэнтры ўвагі не толькі пісьменніка Ігната Дуброўскага, але і вучонага Ігната Чарняўскага. Цяжка сказаць, што ў яго багатай літаратурнай спадчыне пераважае—навуковыя манаграфіі, артыкулы, даклады і выступленні па самых надзённых праблемах развіцця сельскай гаспадаркі ў Беларусі ці апавяданні, нарысы, аповесці. І тое і другое пакінула значны след у эканамічным і культурным жыцці беларускага народа.

Шчыра трэба прызнацца, што першыя апавяданні, сабраныя ў кнізе «Радня», і яго аповесць «Зямля маладзее», напісаная ў 1950 годзе, пры ўсёй маёй прыхільнасці і асабістых сімпатыях да земляка, не выклікалі асаблівага захаплення. Апісальнасць, адсутнасць вострых канфліктаў, прыгладжанасць асобных сітуацый неяк не стасаваліся з упартай, ваяўнічай натурай пісьменніка, які ў сваіх навуковых даследаваннях быў непрымірымым змагаром супраць адміністравання, валюнтарызму і паказухі, што панавалі на фронце барацьбы за ўздым сельскай гаспадаркі.

І толькі, калі з'явіўся нарыс «Светлы шлях», насычаны ад пачатку да канца неўтаймоўнай энергіяй змагання, стала бясспрэчным, што Ігнат Дуброўскі цудоўна валодае пяром мастака-грамадзяніна. Пісьменнік клапоціцца пра тое, каб самую маленькую праўду ператварыць у вялікую праўду мастацтва. У нарысе шмат хвалюючых эпізодаў, якія складаюць шырокае мастацкае палатно, што прываблівае сваёй прастатой, непасрэднасцю, глыбінёй думкі і трапнасцю абагульненняў.

Навуковае пазнанне рэчаіснасці Ігнат Дуброўскі ўмее спалучаць з мастацкім адкрыццём характараў, умее ўсё гэта асвятляць выразнай публіцыстычнай думкай.

Тое самае можна сказаць і пра нарыс «Над Сожам», дзе Ігнат Дуброўскі адкрывае як мастак характэрную з'яву нашага часу: жанчыну, якая кіруе калгасам. І тут пісьменнік застаецца верны свайму творчаму прынцыпу—ад першых ураджанняў ісці да ўнутранага зместу, у самую глыбіню факта, праз асацыяцыі пазнавальнага характару да вобразных абагульненняў.

Публіцыстычныя жанры ў нашай літаратуры закліканы весці разведку боем, памагаць партыі і народу ў фарміраванні чалавека будучыні. Гэтую задачу добра ўсведамляе адзін з правафланговых нашай літаратуры Ігнат Дуброўскі і па загадзе свайго сэрца на кожным павароце сацыяльнай гісторыі кідаецца ў новы бой, каб разведаць тыя шляхі-дарогі, якімі павінны выходзіць на пярэдні край барацьбы за камунізм байцы іншых літаратурных «падраздзяленняў».

Так у старшыні калгаса «Гвардыя» на Гродзеншчыне Андрэю Варанецкім пісьменнік убачыў таго героя нашага часу, які спалучае ў сабе і арганізатара, і загадчыка, і педагога. Чалавека яркай самабытнай культуры, у якім знайшлі сваё праламленне бальшавіцкая прынцыповасць, стойкасць, самаадданасць, пісьменнік ставіць у цэнтр дакументальнай аповесці «Зямныя вузлы», каб адлюстраваць у ёй рух таго часу, калі партыя пачала рашуча пераадольваць «адміністрацыйны сверб» у кіраванні сельскай гаспадаркай і перайшла да кваліфікаванага, навукова-абгрунтаванага вядзення ўсіх спраў на вёсцы.

У сваіх нарысах Ігнат Дуброўскі выступае пісьменнікам, нецярпімым да шуму хуткаплынных кампаній, выступае чалавекам, улюбёным у зямлю і ў людзей, якія ўмеюць жыць і працаваць на зямлі. Віншуючы Ігната Цімохавіча з шасцідзесяцігоддзем, хочацца пажадаць яму добрага здароўя і прычакаць неўзабаве гэтакіх жа цікавых, як ранейшыя, сустрэч з новымі раздзеламі галоўнай кнігі яго жыцця—кнігі аб зямлі.

Уладзімір ЮРЭВІЧ.

СЯРОД КНІГ

З АГЛЯДКАЙ НА ХРЭСТАМАТЫЮ

Перада мной — прыгожа аформленая кніга «Выбраныя творы XIX і пачатку XX стагоддзяў». Яна выйшла ў серыі «Школьная бібліятэка». Трэба думаць, што кніга прызначана для школьнікаў старэйшых класаў, дакладней, 9-га класа, у якім вывучаецца літаратура гэтага перыяду.

Паглядзім, наколькі кніга дасць магчымасць вучням шырэй пазнаёміцца з тымі творамі «праграмных» пісьменнікаў, якія не ўвайшлі ў хрэстаматыю, у якой ступені дасць яна ўяўленне вучням пра тых аўтараў, якія, хаця і не з'яўляюцца «праграмнымі», але, тым не менш, пакінулі вялікі след у гісторыі нашай літаратуры.

Перш за ўсё здзіўляе памер кнігі: 4,98 друкаванага аркуша. Не ведаю, па чыёй віне сталася так, што кніга атрымалася такой куртатай, бо ў плане выдавецтва на яе было вызначана 10 аркушаў. І, безумоўна, калі б гэтыя дзесяць аркушаў запоўніць адпаведным матэрыялам, атрымалася б досыць прыстойная кніга. На сотні ж старонак наўрад ці можна паказаць вучням лепшыя ўзоры нашай літаратуры XIX — пачатку XX стагоддзяў.

З «праграмных» аўтараў твораў Купалы і Коласа ў кнізе няма наогул. Што ж, можа гэта і правільна, бо лепшыя творы Купалы і Коласа павінны ў самы бліжэйшы час выйсці асобнымі кнігамі ў серыі «Школьная бібліятэка».

Дуніна-Марцінкевіча ў хрэстаматыі для 9-га класа даецца два творы: «Гапон» і «Пінская шляхта» (абодва скарочана). У «Выбраных творах...» «Пінская шляхта» друкуецца цалкам. Ці пашыраецца гэтым самым уяўленне вучняў пра Марцінкевіча? Думаецца, што не, бо ў хрэстаматыі камедыя даецца з нязначнымі купюрамі. Відаць, лепш было б укладальніку даць замест «Пінскай шляхты», якую кожны вучань можа прачытаць у хрэстаматыі, хаця б у скарочаным выглядзе «Залёты» і адну з вершаваных аповесцей — «Вечарніцы» або «Шчадроўскія дажынкі».

Лепш у гэтых адносінах падабраны творы Багушэвіча, Цёткі і Багдановіча, хаця ўсё роўна далёка не так, як хацелася б. Хрэстаматыя змяшчае шэсць твораў Багушэвіча, пяць — Цёткі, дванаццаць — Багдановіча. У кнізе «Выбраныя творы...» — адпаведна адзінаццаць, дванаццаць і трыццаць тры. З іх дубліруюць хрэстаматыю з шасці твораў Багушэвіча — чатыры, з трыццаці трох Багдановіча — дзесяць, з пяці Цёткі—усе пяць. А між тым такія вядомыя і важныя для разумення грамадска-палітычных поглядаў Багушэвіча вершы, як «Думка», «Быў у чыстцы», «Ахвяра», апавяданне «Тралялёначка», не трапілі ні ў хрэстаматыю, ні ў «Выбраныя творы...» У вучняў будзе далёка не тое ўяўленне пра Багушэвіча, якім яно магло б быць.

Яшчэ горш атрымалася з Цёткай. Кніга «Выбраныя творы...» дае яе твораў вельмі мала. А варта было б уключыць у яе хоць бы, напрыклад, артыкул Цёткі пра родную мову з 3-яй кніжкі «Лучынкі» за 1914 год. Такія творы карысна ведаць вучням. Яны вучаць маладое пакаленне шанаваць і берагчы сваю мову, беражліва ставіцца да здабыткаў роднай культуры. Не ўвайшлі ў зборнік таксама апавяданне «Навагодні ліст», вершы «Небывалыя часы», «Ласы», «Пад штандарам», «Перад новым годам», «Бунтаўнік». Няма ў зборніку і глыбокіх лірычных маналогаў-гутарак Цёткі са сваёй зямлёю, сваім народам: «У дарогу», «На магіле», «Скрыпка» і інш.

Больш удала падабраны творы М. Багдановіча. Але і многія яго шэдэўры не трапілі на старонкі кнігі «Выбраныя творы...» Я маю на ўвазе перш за ўсё паэму «Страцім Лебедзь», вершы «Пагоня», «Летапісец», «Не кувай ты, шэрая зязюля», «Каганцу», «Змяіны цар» і многія-многія іншыя. Праўда, шмат цікавых твораў Багдановіча ў кнігу ўключана: «Пан і мужык», «Над возерам», «Зразаюць галіны таполі...», «Рушымся, брацця, хутчэй» і іншыя. Усё ж, думаецца, варта ў бліжэйшы час выдаць у школьнай серыі масавым тыражом творы М. Багдановіча.

Хочацца таксама сказаць і пра тых аўтараў, творы якіх у зборнік наогул не трапілі, але якія павінны былі б трапіць. Так, няма ў зборніку ніводнага верша Чачота, ніводнай ананімнай гутаркі, ніводнага верша Баршчэўскага, Лучыны, Гурыновіча, Тапчэўскага, няма ўрыўкаў з аўтабіяграфіі Абуховіча і «Мужыцкай праўды» Каліноўскага. Яшчэ горш атрымалася з пісьменнікамі XX стагоддзя. Варта было б даць лепшыя вершы і апавяданні Бядулі, вершы Гаруна і Гартнага, апавяданні Ядвігіна Ш. і Галубка. Вельмі прыкра, што да гэтага часу не знайшлі належнай ацэнкі творы М. Гарэцкага. Думаецца, у школьную праграму павінны быць уключаны хаця б два яго апавяданні з дакастрычніцкага часу.

Хочацца крыху спыніцца і на ўступным артыкуле Ул. Казберука. У цэлым артыкул напісаны добра, у ім даецца правільная ацэнка тым творам, якія ўвайшлі ў кнігу. Праўда, аўтару трэба было б шырэй паказаць літаратурны працэс, не абмяжоўвацца аналізам канкрэтных твораў.

У цэлым жа, паўтараю, карысць ад кнігі «Выбраныя творы XIX і пачатку XX стагоддзяў» вельмі невялікая. Творы, змешчаныя ў ёй, амаль не дапаўняюць уяўленне вучняў пра родную літаратуру пасля хрэстаматыі. Здзіўляе і мізэрны тыраж кнігі, якая, па задуме, разлічана на школьнікаў рэспублікі.

М. ПРАШКОВІЧ.

«Выбраныя творы XIX і пачатку XX стагоддзяў». Выдавецтва «Народная асвета». Мінск, 1966.

нявестка

Супервокладка і малюнкі мастака Б. Заборава да кнігі Г. Караславава «Нявестка» (пераклад з балгарскай мовы В. Нікіфаровіча), якая выходзіць у выдавецтве «Беларусь».

ПРА ПЕРШУЮ КНІЖКУ ПІСЬМЕННІКА

ХАЙ МАЦНЕЮЦЬ КРЫЛЫ

Кожнага, хто любіць беларускую паэзію, радуе добрая акалічнасць: у паэзію няспынна ідзе маладое папаўненне, з'яўляюцца ўсё новыя імёны. Многія з іх запамінаюцца, аўтары становяцца «знаёмымі».

Не так ужо і даўно Анатоль Канапелька выступіў з першымі студэнцкімі вершамі. Было ў іх нешта такое, што вылучала пачынаючага паэта сярод аднагодкаў. Выклікала сімпатыю чысціня пачуццяў, шчырасць і наіўная непасрэднасць, выказаная ў паэтычным слове. Тыя маленькія парасткі сталі дрэўцамі, зайгралі пералівамі расы, павеялі світальнай свежасцю. Калі чытаеш цяпер «Зямную сімфонію», першую кніжку А. Канапелькі, здаецца, што ўваходзіш у ранішні свет, прапахлы «сіверам, прамытым дажджамі». «Чмялі—чубатыя трубачы — мядзяныя трубы прынеслі»; «зямля вібрыруе ад важкіх МАЗаў і турбін»; «Апошні лісток зялёны трымціць над зямлёй гаманлівай. Аднойчы ў ветраны вечар ён, як сцяжок, загарыцца...». Прырода, поўная гукаў, святла і фарбаў, жыве жыццём, суладным нашаму часу, глядзіць на нас вачыма маладога сучасніка, падпарадкавана яго настрою, волі і жаданням.

У зборніку А. Канапелькі не знойдзеце вершаў, напоўненых касмічнымі асацыяцыямі і тэмамі, такімі моднымі ў наш час. А. Канапелька неяк «па-сялянску», вельмі па-зямному глядзіць на свет і на неба. «Бярозавым сокам, духмяным настоем» пахне ў яго воблака. Начное зімовае неба здаецца «замёрзлым возерам, месяц—глыбокай палонкаю». Такое неба—блізкае, яно ўжо «сваё», абжытае, так і хочацца ўбачыць на ім хлапчукоў з канькамі ці з саначкамі.

З чым ідзе малады аўтар у вялікі свет, на якой ён дарозе, што абвяшчае і што сцвярджае? Пазіцыя яго акрэслена. «Тваёй вялікай праўдаю жыву»,—пачынае ён верш «Радзіме».

Тваім дыханнем перапоўнен я,
Тваім сумленнем матчыным асветлен...

Ёсць у яго заўсёднае адчуванне грамадзянскага абавязку, адказнасці перад будучыняй.

Што зрабіў,
што любіў,
што дарыў — тваё.
(«Яшчэ адна восень...»)

А. Канапелька ўмее стварыць вобраз, надаць радкам гучанне, асвятліць іх думкай. Вось якая мажорная музыка ў вершы «Дажджы»:

Звіняць дажджы,
Звіняць дажджы
Вясновыя,
Харошыя.
Я кроплі жвавыя лаўлю
Велічынёй з гарошыну.

Шумяць дажджы,
Шумяць дажджы
За вокнамі зялёнымі...

У зборніку «Зямная сімфонія» вызначылася тое, што А. Канапелька павінен развіваць, давяраючы сваім пачуццям і здольнасцям. Відаць і тое, ад чаго павінен ён і адмовіцца. Па-першае, яму трэба абмінаць тыя сцежкі, якія пракладзены папярэднікамі. Кажучы яго ж словамі, трэба «адкрываць паэзію нанова з яе неразгаданых крыніц». А якое, напрыклад, адкрыццё ў вершы «Адлёт журавоў»?

Яны плылі над лістападам,
А іх праводзілі вятры.
І на зямлю балюча падаў
Адчайны развітальны крык.

Крыламі ўзмахваючы важка,
Кружыўся жураўліны ключ,
Я зразумеў:
ім вельмі цяжка
Пакінуць родную зямлю.

У гэтага верша даўнасць сапраўды «жураўліная». Да таго ж не атрымалася і звычайнай замалёўкі. Птахі адначасова і плывуць і кружаць, ды яшчэ... ключом.

Хтосьці сказаў, што ссеклі дрэўца і прыгажосці меней стала на зямлі. А. Канапелька паўтарае тое ж самае ў роздуме над зламанай галінкай: «І неяк сумна стала мне, што ў свеце будзе менш адным суквеццем».

А. Канапельку часцяком падводзіць «служба эпітэта», значэнне якой яму вядома. Архаічнымі ў наш час успрымаюцца «віхуры-буры лютыя», «імклівая хада», «салаўіны бэз», «ледзяная крыніца», «шумлівы бор» і г. д.

У вершы «Яшчэ адна восень...» А. Канапелька выказаў правільную думку аб крылах: «Мацнеюць яны, як з вятрамі сустрэнуцца». Хай жа ў маладога паэта будзе больш гэтых зямных, неспакойных вятроў! Тады крылы яго паэзіі будуць намнога мацнейшыя, а палёт яе — вышэйшы.

Аляксей ПЫСІН.

Анатоль Канапелька. «Зямная сімфонія». Вершы. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1966.

Ігнат ДУБРОЎСКІ.



УРЫВАК З АПОВЕСЦІ

БАРЫС БЯЛЬЧУК і Віктар Чарнабыльскі дамовіліся з'ездзіць сёння пасля абеду ў Залужскае аддзяленне саўгаса, каб вырашыць, якую надаць яму спецыялізацыю. Праязджаючы на матацыкле міма птушкафермы, якая стаяла наводшыбе ад сядзібы саўгаса, Віктар заўважыў на дзядзінцы між куратнікамі нейкія рубчавага колеру пірамідкі і курыную мітусню каля іх.

— Стой, Барыс,—крыкнуў ён Бельчуку, які сядзеў за рулём.

Яны спыніліся, зайшлі на ферму. Ад здзіўлення Віктар не мог скрануцца з месца. Перад ім ляжалі тры кучы памідораў, ссыпаныя з машын. Гэта былі тыя памідоры першага гатунку, якія ўчора адправілі на нарыхтоўчую базу. Да куч падбягалі куры, хапалі памідоры і з чырвонымі шарамі ў дзюбах несліся наўцёкі ў самыя далёкія закуткі, нібы ўсведамляючы, што робяць злачынства.

— Што здарылася, Барыс? Чаму іх прывезлі назад? Чаму кінулі курам? — пытаў Віктар.

Але Бяльчук, галоўны аграном саўгаса, таксама не ведаў.

Да іх падышла птушніца цётка Разаля і сказала, што памідоры маюць нейкую загану, таму іх на базе не ўзялі. Яна нават непакоілася, каб яны не пашкодзілі курам.

— А хто іх прывёз сюды? Хто загадаў аддаць курам?—спытаў Віктар.

— Дырэктарыха. Яна ж сама аграном над агародамі. Ведаеце ж, — адказала Разаля.

З фермы Чарнабыльскі і Бяльчук паехалі на агарод. Там яны засталі брыгадзіра агароднай брыгады Пятра Струнку. Ён стаяў ля вагаў, на якіх хлопцы ўзважвалі памідоры, і вёў запіс.

— Мы да вас, дзядзька Пятро,—сказаў Віктар.—Чаму гэта ўчарашнія памідоры, якія збіраліся везці на базу, курам аддалі?

Высокі, худы, заўсёды спакойны, Струнка сумна зірнуў на Віктара з-пад насунутага на вочы саламянага капелюша і раздражнёна ад казаў:

— Не прынялі. Пагрэбавалі нашай працай.

— Чаму? У чым справа?—пацікавіўся Віктар.

— Вы ж — эканаміст саўгаса і, можна сказаць, вучоны, як вы думаеце? Ёсць на гэта якая ўправа ці няма? Здавай, кажа той гіцаль на базе, нестандартам, то яшчэ падумаем, можа возьмем. Гнаць трэба гэтых круцялёў з нарыхтоўчых баз!—І Струнка моцна выляяўся.

— Прагоніце аднаго, дзядзька Пятро, знойдзецца другі. Трэба, мусіць, нейкія новыя парадкі ўводзіць.

— Яно і то,—згадзіўся Струнка. Ён павярнуўся ў той бок, дзе кабеты з кошыкамі рвалі памідоры, і гукнуў:—Аляксееўна, ідзіце сюды!

Падышла Паваротная.

— Акцябрына Аляксееўна, чаму вы загадалі аддаць памідоры курам?—спытаў Віктар.

— Гэта не я, гэта дырэктар.—І Паваротная зрабілася чырвоная, як той памідор.

Яна заўсёды бянтэжылася пры Віктары. Віктар з першых дзён работы ў саўгасе заўважаў гэту бянтэжлівасць і нейкую прыгнечанасць у настроі Рыны. Нібы яна была вінавата ў нечым перад усімі. Рына, рослая, смуглявая, з вялікімі задуменнымі, як бы трошкі спуджанымі, вачыма, падабалася Віктару, але ён ніяк гэтага не паказаў ёй. Ён за год работы ў саўгасе нават не сказаў ёй самага простага жарту. І не таму, што Рына—жонка дырэктара саўгаса. Нешта сваё рабіла яго асцярожным, а можа нават і баязлівым у адносінах да дзяўчат і жанчын наогул. Гэта заўважаў шмат хто. Але ўсё ж людзі неяк угадвалі, што Рына падабаецца Віктару, а што ён падабаецца ёй, меркавалі па тым, як яна саромеецца яго.

Аднойчы Наста Раковіч, ужо сталая кабета з агароднай брыгады, пашкадавала Рыну пры Віктары, што дырэктар саўгаса Ворваль прымусіў яе выйсці за яго замуж. Праўда, Рыны пры гэтай гутарцы не было.

— А якая хвацкая дзяўчына была, каб ведалі...—гаварыла Наста.—Як выйшла за яго, як у ваду апусцілася. Яна не хацела. Прымусіў. Уся ўласць у яго. Што ж пытаеце? Кінуў старую? Няпраўда гэта, яна яго зраклася. Не ведаю ўжо, што там было. Але і Рынцы не жыць за ім. Вось з вас бы з ёю пара добрая была б. Ой, не кажыце! Яна вам падабаецца. А вы ёй!..

Віктар, заўважыўшы, што Паваротная збянтэжылася, адвярнуўся ўбок і задумаўся, што рабіць з памідорамі.

Жанчыны, якія рвалі памідоры на агародзе, убачыўшы галоўнага агранома і эканаміста саўгаса, пакідалі работу і адна за адной пацягнуліся да дарогі.

— Слухайце, аграном, што гэта робіцца?—звярнулася Наста Раковіч да Бельчука.—Мы лецейка цэлае б'ёмся, б'ёмся, а нейкі там з пустой мазгавешкай...

— А што вам, цётка Настуля?—перапыніў яе Бяльчук.—Здадуць тыя памідоры ці не—вам за работу аднолькава заплацяць.

Наста выкругліла вочы і падступілася да Бельчука.

— І гэта вы так кажаце? Мая сястра ў горадзе жыве, дык яе дзеці хоць якой памідоры не жадны. А тут памідоры—чыстая кроў!—на сметнік выварочваюць,—абуралася Наста.

Загаманілі ўсе жанчыны.

— Сціхніце вы!—прыкрыкнуў на іх Струнка.

Калі Віктар адвярнуўся, Рына падумала, што ён наогул не хоча больш гаварыць пра памідоры.

— Што ж рабіць?—пытала яна, ні да каго не звяртаючыся.

— Грузіць ды заўтра везці на базу,—адказаў Віктар.—Я таксама з вамі паеду.

Бяльчук і Чарнабыльскі паехалі ў Залужжа, кабеты пайшлі зноў рваць памідоры. Рына пайшла ў кантору афармляць дакументы на здачу памідораў. Струнка павесялеў і стаў падганяць хлопцаў. Ён спадзяваўся, што гэты малады эканаміст Віктар Чарнабыльскі напэўна паможа. Ён паважаў Віктара, лічыў яго разумным і смелым. Не дарма ж вучоны! Года яшчэ не прабыў у саўгасе, а шмат добрага зрабіў. Гэта ж ён дабіўся, каб саўгас, які займаў паураёна, раздзялілі на чатыры гаспадаркі. У аплаце працы зноў жа ён парадак наладзіў. Гаспадарчы разлік увёў у брыгадах і аддзяленнях. Наогул, у гаспадарцы ўсё палепшылася. Ведама, зараней усё пералічыць, падрахуе. А то рабілася як папала, як зверху гукнуць. Праўда, поўзаюць плёткі, нібыта Чарнабыльскага пратурылі з інстытута за тое, што ў некага адбіў жонку і ажаніўся з ёю яшчэ да яе разводу з мужам. Струнка не верыў у гэта. Вельмі ж ужо непадобна, каб так мог зрабіць гэтакі хлопец, як Чарнабыльскі. А ўрэшце, чаго ў жыцці не бывае... Ну, няхай сабе. Але ж затое ён і за справы бярэцца з розумам. А другі толькі і можа, што жонак мяняць... Недалюбліваў Струнка Ворваля, дырэктара саўгаса.

□ □ □

Яшчэ з учарашняга дня каля нарыхтоўчай базы стаяў абоз машын з рознай гароднінай. Прыйшлося чакаць, пакуль абыякавы і грубаваты прыёмшчык падышоў да машын, грэбліва пакорпаўся ў памідорах і сказаў:

— Падганяйце да таго дашчанога склада. Слухай, Сяргей, прымай гэтыя ў нестандарт, — гукнуў прыёмшчык маладому хлопцу, які складваў скрынкі пад сцяну барака.

— Чаму ў нестандарт? Гэта ж памідоры першага гатунку, — запярэчыў Віктар.

— А таму, — адказаў прыёмшчык, павярнуўся і пайшоў.

За ім кінулася некалькі чалавек, усе яны наперабой прасілі:

— Таварыш Сарвэцкі, прыміце, калі ласка, нашы.

— Сказаў і вам: нестандартам, — не аглядваючыся, кінуў Сарвэцкі.

Адзін з тых, што беглі за Сарвэцкім, відаць, старшыня калгаса, паскроб патыліцу, скрывіўся, злосна вылаяўся і гукнуў у той бок, дзе стаяў абоз машын:

— Сымон! Давай, гані да склада. Не выкідаць жа!

— Ці не здаваць мо і нам?—няпэўна спытаў Струнка.

— Не-е-е! — пакруціла галавой Рына. — Нашы ж куды лепшыя.

— Хадзем да дырэктара базы, — прапанаваў Віктар.

Рына зрабіла з газеты пакунак, наклала памідораў, і яны пайшлі ў кантору.

Выслухаўшы Чарнабыльскага, тоўсты, з начыста паголенай галавой, дырэктар базы Шамко спакойна, нават са спачувальнай усмешкай адказаў:

— Дарагі мой, нічога не магу зрабіць. Не хочаце — не здавайце, мы ж вас не прымушаем. Першым гатункам мы яшчэ ні ад кога не прымалі. Няхай будзе вам вядома. Што? Будзеце скардзіцца? Права кожнага. Навошта вам даводзілі такі план пасадкі гароднінны? Не ведаю, дарагі мой. Мы яго вам не даводзілі. Ведаеце, прымем, а куды збыць? Страты. А гэта—дзяржава.

— А мы не дзяржава? А хто нашы страты пакрые? Зрэшты, навошта вам трымаць гародніну на складзе. Узважце, афармляйце прыёмку і адразу ж на нашых машынах адпраўляйце ў магазіны, — хвалюючыся, запярэчыў Віктар.

— Ну-ну, бачу, спрытны ты, малады чалавек. Парадак — ёсць парадак, — павучальна сказаў Шамко. — Дзяржавай устаноўлены, і яго нельга парушаць.

— А я думаю, што ўсе гэтыя парадкі, якія замінаюць перадачы гатовай прадукцыі спажыўцам, трэба скасаваць. А мо і вашу базу. Навошта яна? Адны страты ад яе і дзяржаве і народу, — ужо не стрымліваючы сябе, гарачыўся Віктар.

— Хо-хо! — весела ўскінуў рэдкія рыжыя бровы Шамко. — Цэлую рэвалюцыю збіраешся рабіць. З ранніх... Не раю ісці супроць ветру.

— Нічога, караблі ідуць і супроць ветру, — не сунімаўся Віктар.

— Высока сябе ставіш! — зарагатаў Шамко.

— Я маю на ўвазе дзяржаву. Я — чалавек маленькі, — трошкі збянтэжыўся Віктар.

— Паслухайце мяне, — звярнуўся Шамко да Стрункі, які ўвесь час моўчкі круціў у руках свой саламяны капялюш, — ідзіце да таго, хто

(Заканчэнне на 4-й стар.).

ШАТА РУСТАВЕЛІ І ЯГО ПАЭМА

Аляксандр БАРАМІДЗЕ,
акадэмік Акадэміі навук Грузінскай ССР

Сярэдневяковая Грузія дасягнула свайго найвышэйшага развіцця ў палітычных, эканамічных, сацыяльных і культурных адносінах у XII стагоддзі. У жыцці грузінскага народа гэта быў перыяд магутнага ўздыму матэрыяльных і духоўных сіл.

Гэта быў росквіт навукі, грамадска-палітычнай і філасофска-багаслоўскай думкі, у значнай ступені свабоднай ад царкоўнай дагматыкі і схаластыкі. У гэты ж час зарадзілася і пышна расцвіла свецкая літаратура.

XII стагоддзе — класічны перыяд у гісторыі грузінскай сярэдневяковай культуры. На жаль, з літаратурнай спадчыны гэтага перыяду многае і каштоўнае страчана ў выніку катастроф у наступныя стагоддзі. Але нават нямногія помнікі старажытнагрузінскай свецкай літаратуры, што дайшлі да нас, гавораць пра яе разнастайнасць і багацце. Завяршэннем яе з'явілася славутая паэма Шата Руставелі «Віцязь у тыгравай шкуры».

Дакладных біяграфічных звестак пра Руставелі захавалася вельмі мала. Галоўная крыніца дадзеных пра «Віцязя» і яго аўтара — пралог паэмы, дзе двойчы ўпамінаецца Руставелі (дакладней Руствелі), што азначае «ўласнік Рустаўскага замка або Рустаўскага маёнтка». Імя паэта Шата засведчана ў іканаграфічных і літаратурных помніках яшчэ з пачатку XIII стагоддзя. Шата Руставелі быў дзяржаўным казначэем царыцы Тамары. Паэт уславіў сваю ўладарку і яе мужа Давіда. Гэтае прысвячэнне і дае ключ да датыроўкі паэмы: яна магла быць напісана не раней канца васьмідзесятых гадоў XII стагоддзя і не пазней першага дзесяцігоддзя XIII стагоддзя.

Сюжэт паэмы цікавы і займальны. Славуты цар Аравіі Растэван, не маючы сына-наследніка, узводзіць на прастол сваю адзіную дачку, прыгожую і разумную Цінацін, якая кахае слаўнага рыцара-палкаводца і царадворца Аўтандзіла. Аднойчы ў час палявання Растэван і Аўтандзіл сустрэліся ля ручая з таямнічым, агорнутым смуткам віцязем, апранутым у тыгравую шкуру. Усе спробы загаварыць з ім аказаліся марныя, ён бясследна знік. Засмучанага цара ахапіла маркота. Тады Цінацін даручыла свайму каханаму рыцару ў што б там ні было знайсці загадкавага чужаземца. Аўтандзіл ахвотна бярэцца выканаць даручэнне сваёй патранесы. Пасля доўгіх і цяжкіх блуканняў ён знаходзіць загадкавага віцязя па імю Тарыэл. Віцязь расказвае Аўтандзілу сваю сумную гісторыю: ён — нашчадак царскага роду і амірбар індыйскага цара Парсадана, ён пакутуе ад страснага кахання да прыгожай царэўны Нестан-Дараджан. Лёс не быў спрыяльны да закаханых. Цар Парсадан вырашыў аддаць Нестан-Дараджан замуж за харэзмійскага царэвіча і аб'явіць яго наследнікам прастола, хоць па праву наследнікам лічыўся Тарыэл. Нестан-Дараджан угаварыла свайго каханага забіць саперніка і захапіць уладу.

Царэўну абвінавачваюць у распусным каханні да мяцежніка і сурова караюць: пасля жорсткіх пабояў яе тайна вывозяць за межы Індыі. Тарыэл кідаецца на пошукі каханай, але дарэмна. Страціўшы ўсякую надзею знайсці яе, ён пакідае радзіму, адасабляецца і жыве ў пячоры. Аўтандзіл братаецца з Тарыэлам, суцяшае, абнадзейвае яго і адпраўляецца на пошукі Нестан-Дараджан. І нападае на яе след. Яна зняволена ў непрыступнай крэпасці Каджэці. Тарыэл і Аўтандзіл пры садзеянні трэцяга пабраціма — Прыдона — авалодваюць крэпасцю і вызваляюць Нестан. Радасныя, шчаслівыя віцязі вяртаюцца ў родныя краі.

Як відаць з гэтага кароткага зместу, сюжэт «Віцязя ў тыгравай шкуры» разгортваецца на вялікай геаграфічнай прасторы, персанажы паэмы — прадстаўнікі розных народаў (у тым ліку і выдуманых). Паэт удала ўнікае сюжэтных паўтораў і расцягнутасці, характэрных для твораў эпічна-апавядальнага жанру. Паэма Руставелі дынамічная, дзеянне ў ёй разгортваецца хутка, нарастае натуральна і лагічна.

Па-мастацку, праўдзіва адлюстроўвае Руставелі разнастайную і складаную рэчаіснасць Грузіі XII стагоддзя. Вельмі дакладна выказвае паэт свае рэлігійна-філасофскія і сацыяльна-палітычныя погляды, з майстэрствам вялікага мастака слова раскрывае характары герояў, паказваючы іх багаты духоўны свет. Глыбокая псіхалагічная характарыстыка персанажаў і пранікнёны паказ унутранай сутнасці з'яў—яркая рыса творчага наватарства грузінскага мастацкага слова і грузінскага верша.

«Віцязь у тыгравай шкуры» — хвалюючая паэма пра каханне і пакланенне жанчыне. Каханне, якое прапаведуе Руставелі, — не абстрактная, беспрадметная духоўная страсць, а глыбокае зямное чалавечае пачуццё. Яно выклікае да жыцця ўсё лепшае, што тоіцца ў прыродзе, яно ўзнімае чалавека на гераічныя справы, на самаахвярнасць. Руставелеўскае каханне і для мужчыны і для жанчыны — вялікае выпрабаванне; толькі гераічным парывам і доблесцю можа заваяваць мужчына сэрца абранніцы, толькі рыцарскай самаадданасцю, бездакорным выкананнем грамадскага абавязку, бязмежнай адданасцю радзіме можна заслужыць давер'е каханай. Што асабліва важна, Руставелі лічыць каханне асновай сям'і і шлюбу. Паэт абвяшчае свабоду пачуццяў, рэзка асуджаючы прымус і гвалт у шлюбе. Як вядома, у сярэднія вякі гэта было нечуванай справай. Імена гэтую «нечуваную справу» і ўславіў вялікі грузінскі паэт XII стагоддзя.

Паэт сцвярджае роўнасць мужчын і жанчын, падкрэсліваючы, што, як ільвяняты (ці то самка ці самец), роўныя паміж сабою, таксама роўныя мужчыны і жанчыны.

Руставелі стварыў цудоўны жаночы вобраз у асобе пяшчотнай і мужнай Нестан-Дараджан. Славутае пісьмо Нестан-Дараджан да каханага з Каджэці — яркае паэтычнае выказванне велічы жаночага кахання, перамогі розуму над страсцямі, натхнёная споведзь чалавека, гатовага на любыя подзвігі і на любыя ахвяры ў імя ўзнёслых мэт.

Руставелі ўвабраў у сябе ўсе багацці старажытнагрузінскай пісьмовай культуры і адначасова, наследуючы лепшыя традыцыі народнай славеснасці, развіў і ўзняў на небывалую вышыню грузінскую паэзію. Ідэі, адлюстраваныя ў паэме «Віцязь у тыгравай шкуры», глыбока самабытныя, народныя і нацыянальныя. Свет ідэй Руставелі выходзіць за рамкі адной нацыянальнасці, яны ўласцівыя і іншым народам — малым і вялікім. Грузінскаму паэту нават ва ўмовах панавання рэлігійна-містычнай ідэалогіі XII стагоддзя ўдалося па-мастацку ўвасобіць гэтыя цудоўныя ідэі ва ўзорнай паэтычнай форме.

Руставелі — вялікі гуманіст. У цэнтры яго ўвагі — чалавек ва ўсёй сукупнасці і непасрэднасці пачуццяў, перажыванняў, страсцей і імкненняў. У процілегласць сярэдневяковаму разумоваму пустэльніцтву, царкоўна-аскетычнай маралі Руставелі абвясціў свабоду чалавечай асобы, свабоду думкі і ўсяго духоўнага жыцця. Сваім вальнадумствам, сваімі ідэаламі Руставелі прадугадаў гуманістычныя ідэі ранняга Рэнесансу. Руставелеўскія ідэі таксама свежыя, цудоўныя і арыгінальныя, як чароўныя яго вершы.

Геній Руставелі высока ўзняўся над узроўнем развіцця сучаснага паэту грамадства. Яго ўдумлівы позірк пранік у глыбіню будучых стагоддзяў, і гэтае пранікненне робіць яго блізкім перадавой грамадскасці кожнай новай эпохі, кожнага народа.

АДН.

КІНАСТУЖКА—ЛЕТАПІС ЭПОХІ

Аляксей САЗОНАЎ,
начальнік Упраўлення па вытворчасці навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў Камітэта па кінематаграфіі пры Савеце Міністраў СССР

Дакументальнае кіно ўсё больш уваходзіць у жыццё людзей, грамадства, усё больш становіцца крыніцаю вобразнай інфармацыі аб важнейшых падзеях, што адбываюцца ў краіне і за рубяжом. Яго сіла, эмацыянальнае ўздзеянне ў значнай ступені вызначаюцца майстэрствам мастацкага ўвасаблення, разнастайнасцю і выразнасцю выяўленчых сродкаў.

Давайце трошкі больш падрабязна спынімся на стужках апошняга часу — вельмі характэрных для сучаснага этапу развіцця савецкага дакументальнага кіно.

Робячы агляд фільмаў пра сучаснае жыццё, лягчэй за ўсё ўстанавіць, што такое сапраўднае наватарства і ці правамернае поўнае адмаўленне так званых «старых» прыёмаў, якое абвяшчаюць некаторыя майстры. Вось стужка Узбекскай студыі «Трынаццаць ластавак». У ёй няма схаванай камеры, трансфакатара, дынамічнага мантажу. Па ўсіх прыкметах гэтая стужка традыцыйная. Але ўглядзьцеся — і вы зразумееце, якая гэта на дзіва наватарская і таленавітая карціна! За дзесяць мінут у ёй расказваецца пра добрыя здзяйсненні ў жыцці ўзбекскага народа больш і больш пераканаўча, чым у любым «справаздачным» поўнаметражным фільме...

Неацэнны кіналетапіс мінулых год — гісторыя дваццатага стагоддзя, гісторыя рэвалюцыі і войнаў у руках сучасных мастакоў нараджае незабыўныя палотны. Праўда, на жаль, гэты кіналетапіс нярэдка перадае толькі вонкавы бок з'яў, але вінаваціць тут няма каго. Кінематограф у тыя далёкія часы быў яшчэ дзіцем, якое рабіла першыя нясмелыя крокі і не ўмела гаварыць. Тое, што мы здымаем цяпер, стане неацэнным для будучых пакаленняў кінапубліцыстаў таму, што галоўным сёння стаў Чалавек у сваёй духоўнай і стваральнай сутнасці. Кінадакументалістыка становіцца чалавеказнаўствам. У гэтым яе вышэйшае дасягненне і наватарства.

Чалавеказнаўства па сваёй прыродзе немагчыма без развіцця індывідуальнага мастацкага почырку, без пошукаў новых сродкаў мастацкага выяўлення побач з удасканаленнем старых.

Вялікую цікавасць мае фільм «Рэпартаж года» латвійскіх дакументалістаў Франка, З'едоніса і Фрэйманіса, прысвечаны 25-годдзю Савецкай Латвіі. Ён прынцыпова адрозніваецца ад раней кананізаванага аглядна-юбілейнага жанру. У гэтай карціне рэспубліка паўстае перад намі перш за ўсё ў яе людзях, у іх канкрэтных справах і здзяйсненнях.

У карцінах «Магістраль» (Свярдлоўская студыя), «Транзіт» (Усходнесібірская студыя), «А дзяўчаты ўсё едуць» (Далёкаўсходняя студыя), зусім розных людзей радуе адно агульнае — жаданне аўтараў не столькі паказаць, як наша моладзь будуе, колькі зразумець, у імя чаго яна гэта робіць, — спроба раскрыць прыроду працоўнага подзвігу.

Без усялякай каардынацыі Мінская, Маскоўская і Кіргізская кінастудыі амаль адначасова выпусцілі фільмы— «Шчырая размова», «Мангышлак — пачатак дарогі» і «Там, за гарамі, гарызонт». Яны пабудаваны на прыёме кінаінтэрв'ю. Аўтары па-рознаму спрабуюць раскрыць важныя пытанні працоўнай дзейнасці і грамадскага жыцця нашых сучаснікаў. Найбольш удалай з іх, па-мойму, атрымалася стужка Мінскай студыі «Шчырая размова» — кінематаграфічная, яркая, вобразная.

Да гэтага часу ў адзіным экземпляры ў нас існавала выставачная поліэкранная ўстаноўка з некалькімі адначасова дзеючымі экранамі. Выйсці за межы выставачнага стэнда такі від кінематографа і не прэтэндаваў. І вось цяпер на Кіргізскай кінастудыі здымаецца поўнаметражны дакументальны фільм «Азірніся, таварыш», дзе поліэкран у спалучэнні з пульсіруючым варыяэкранам адкрывае зусім новыя творчыя магчымасці кіно. Пакуль яшчэ гэта толькі першы нясмелы крок, нешта накшталт дзіцячага трохкалёснага веласіпеда. Але такім чынам кінематограф пачынае ператварацца не ў утапічную уэлсаўскую, а ў зусім рэальную «машыну часу», дзе можна злучаць у адно на двух і больш паралельна жывучых экранах далёкае мінулае і цяперашняе, сутыкаць мінулае з будучым.

Цяпер у нас ствараюцца буйныя дакументальныя кінатворы, якія прысвячаюцца 50-годдзю Вялікага Кастрычніка. Раскажу пра чатыры стужкі. «Краіна мая» — так называецца каляровая стэрэафанічная карціна, якую рэжысёр Ілья Капалін здымае на Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў. У ёй будзе расказана пра сённяшняе жыццё Краіны Саветаў, пра тое лепшае, з чым народ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ідзе да юбілею, расказана без салодзенькага аздаблення, з пачуццём уласнай годнасці і законнай гордасці за дасягнутае ў галіне эканамічнага і культурнага будаўніцтва.

У каляровым поўнаметражным фільме пра Савецкую Армію, які стварае рэжысёр Барыс Небыліцкі, будзе паказана магутнасць Узброеных Сіл Савецкага Саюза. Карціна пазнаёміць гледачоў з майстрамі ваеннай справы — салдатамі і афіцэрамі, якія дасканала авалодалі самай сучаснай баявой тэхнікай. Нашы воіны заўсёды напагатове. Яны гатовы ўтаймаваць любога агрэсара, які паспрабуе замахнуцца на наша жыццё.

Кінадакументалісты Латвіі ствараюць да юбілею шырокаэкранны двухсерыйны фільм «СССР — 1966-ты». Працуюць чатыры здымачныя групы. Будзе паказана жыццё краіны ў гэтым годзе — важнейшыя падзеі пераплятаюцца з падзеямі ў жыцці людзей: дзень нараджэння, першае каханне, выпускны экзамен, выбранне ў парламент краіны...У арганічнай знітаванасці асабістага і грамадскага, інтымнага і дзяржаўнага павінен узнікнуць на экране наш лад жыцця, аблічча эпохі.

Карціна «Лёс чалавечы» (Сяргея Абразцова і Ісака Грэка) — гэта філасофскі агляд сучаснага жыцця чалавецтва, фільм пра сацыяльную несправядлівасць, пра імкненне да лепшага, пра роўнасць усіх народаў. Ідэі мірнага суіснавання, барацьбы за сацыяльны прагрэс — аснова гэтага твора.

Дакументальнае кіно ў другой палавіне дваццатага стагоддзя з дадатку да мастацкага фільма ў праграме кінасеанса ператвараецца ў вялікае мастацтва. Яно ўсё больш прыкметна ўплывае на іншыя жанры кіно.

Не так даўно толькі мастацкія фільмы былі здольныя выклікаць у гледачоў слёзы, радасць, нянавісць, асалоду. А дакументальныя фільмы прэтэндавалі толькі на інфармацыю. Сёння гледачы перажываюць усе эмоцыі на лепшых дакументальных фільмах, такіх, як «Звычайны фашызм», «Кацюша», «Вялікая Айчынная», «Подзвіг», «Сяргей Ясенін», «Трынаццаць ластавак» і многіх іншых... «Лішні білецік» кінагледачы просяць незалежна ад таго, ігравая гэта карціна ці дакументальная.

АДН.

ШЫРОКАЭКРАННЫ ПЕРАСОЎНЫ

Кіно — адзін з важнейшых сродкаў прапаганды культурных ведаў у сельскай мясцовасці. Але дзесяткі тысяч кінаперасовак аснашчаны апаратурай для дэманстрацыі звычайных, не шырокафарматных фільмаў. Аднак культурныя запатрабаванні сельскіх жыхароў пастаянна растуць і, каб задаволіць іх, патрэбна сучасная апаратура.

Да нядаўняга часу савецкая прамысловасць выпускала для кінатэатраў праектары КПТ, прызначаныя для плёнкі шырынёю 35 міліметраў. А універсальных праектараў КП-15 і КП-30, якія дазваляюць дэманстраваць любыя фільмы, пакуль мала.

Некаторы час назад група энтузіястаў, якую ўзначалілі галоўны інжынер Растоўскага абласнога ўпраўлення кінафікацыі Мікалай Позенаў і зменны інжынер растоўскага кінатэатра «Расія» Аляксандр Кавалёў, стварыла арыгінальны ўзор кінапраектара КПШП-1.

Замяніўшы ў праектары КПТ дэталі стужкапрацяжнога механізму, яны прыстасавалі яго пад плёнку 70 міліметраў. Давялося зрабіць новыя зубчастыя барабаны, ролікі, фільмавы канал. Нязменнымі засталіся праекцыйная частка, асвятляльнік і крыніца жыўлення. Эксперыменты паказалі, што гэта дапушчальна: оптыка і светлавы паток пры дэманстрацыі шырокафарматных фільмаў забяспечваюць нармальную асветленасць па ўсяму кадру.

Мадэрнізаваны праектар у чатыры разы таннейшы за такія складаныя апараты, як КП-15 або КП-30.

У Сальску, Новачаркаску, Таганрогу і некаторых іншых гарадах і вёсках Растоўскай вобласці ўжо дэманструюцца шырокафарматныя фільмы. За апошнія тры гады растаўчане зрабілі каля дваццаці мадэрнізаваных праектараў і для іншых гарадоў. У Магадане, Горкім, Саратаве, Ерэване, Фрунзе і Чабаксарах яны працуюць бездакорна, атрымалі прызнанне гледачоў і кінамеханікаў.

Эдуард БЯЗУГЛАЎ,
інжынер
(АДН).



ВЕРАСЕНЬ. На рацэ Сож. Фота М. МІНКОВІЧА.

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ

Часопіс «Полымя» са студзеня 1967 года будзе павялічаны на 64 старонкі, а падпісная плата і кошт асобнага нумара застаюцца ранейшыя.

У 1967 годзе «Полымя» надрукуе:

НОВЫЯ РАМАНЫ

І. МЕЛЕЖА — «За асакою бераг»,
І. ШАМЯКІНА — «Паядынак»,
М. ЛОБАНА — «Гарадок Устронь»,
Ул. КАРАТКЕВІЧА — «Каласы пад сярпом тваім» (заканчэнне),
Ул. КАРПАВА — «Сотая маладосць»,
П. ПЕСТРАКА — «Лесавічанка».

НОВЫЯ АПОВЕСЦІ

А. ВАСІЛЕВІЧ — «Знайдзі долю»,
Р. САБАЛЕНКІ — «Лора»,
І. ПТАШНІКАВА — «Тартак»,
І. ЧЫГРЫНАВА — «Плач перапёлкі».

НОВЫЯ АПАВЯДАННІ, ВЕРШЫ, П'ЕСЫ І АРТЫКУЛЫ

М. Аўрамчыка, С. Александровіча, М. Алексютовіча, Р. Барадуліна, П. Броўкі, Я. Брыля, Р. Бярозкіна, Г. Бураўкіна, Я. Васілёнка, В. Віткі, М. Грамыкі, Н. Гілевіча, І. Грамовіча, С. Грахоўскага, Ул. Дамашэвіча, Ул. Дубоўкі, С. Дзяргая, А. Зарыцкага, Я. Казекі, В. Каваленкі, Г. Кісялёва, А. Клышкі, Р. Клюсава, Г. Коласа, Ул. Корбана, К. Крапівы, А. Куляшова, А. Кулакоўскага, Ул. Калесніка, В. Круталевіча, М. Лужаніна, М. Лынькова, І. Навуменкі, А. Наўроцкага, Р. Няхая, П. Панчанкі, Н. Пашкевіча, Н. Перкіна, М. Прашковіча, Ю. Пшыркова, А. Русецкага, М. Смолкіна, А. Савіцкага, Б. Сачанкі, Я. Сіпакова, М. Стральцова, Т. Хадкевіча, М. Хведаровіча, А. Чарнышэвіча, В. Чамярыцкага, Ул. Юрэвіча.

Новымі цікавымі матэрыяламі будзе шырока прадстаўлены раздзел «Да 50-годдзя Савецкай улады».

У раздзеле «Успаміны, дзённікі, дакументы» будуць апублікаваны тэатральныя запіскі Л. Александроўскай, аўтабіяграфія Р. Шырмы, «Лісткі календара» М. Танка, «Варакомскі гасцінец» В. Адамчыка і новыя архіўныя знаходкі.

Часопіс мае і такія раздзелы, як «У свеце мастацтва», «Крытыка і літаратуразнаўства», «Культура мовы», «Перапіска з чытачамі», «Наша энцыклапедыя», «Публіцыстыка», «Нарысы».

У дапамогу выкладчыкам літаратуры будуць друкавацца артыкулы пра лепшыя творы беларускай літаратуры.

У 1967 годзе на старонках «Полымя» шырокае месца знойдуць у перакладзе на беларускую мову найлепшыя апавяданні, аповесці і раманы пісьменнікаў братніх рэспублік, краін народнай дэмакратыі і прагрэсіўных пісьменнікаў Еўропы, Амерыкі, Азіі і Афрыкі.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

на 1 год 6 руб.
на 6 месяцаў 3 руб.
на 3 месяцы 1 руб. 50 кап.
Цана асобнага нумара 50 кап.

Своечасова афармляйце падпіску на часопіс «Полымя» на 1967 год.

ГОРАДУ—7 ТЫСЯЧ ГАДОЎ

Гэтаму гораду, які знаходзіцца ў Хафтане ў 120 кіламетрах ад Ахваза (Паўднёва-Заходні Іран) і налічвае сем тысяч год, яшчэ не дадзена поўная гістарычная ацэнка. Гэта пакуль цяжка зрабіць, бо з-пад каменняў, пяску і гліны вызвалены толькі асобныя яго часткі, раскрыты не ўсе будынкі, знойдзены не ўсе рэчы ўжытку і не ўсе мастацкія каштоўнасці. Аднак папярэднія вывады гавораць аб тым, што іранскія археолагі адкрылі важную старонку ў гісторыі развіцця цывілізацыі.

Якія ж падставы дазваляюць рабіць такія заключэнні? Што паўстала ў Хафтане перад позіркам вучоных і шматлікіх турыстаў, якія хлынулі ў раён раскопак?

Адна са знаходак—старажытны храм, у якім, як мяркуюць, рабіўся абрад пакланення богу агню. Памер яго раскапанай часткі невялікі: 80 квадратных метраў. Сцены яго ўпрыгожаны роспісам і рэльефнымі малюнкамі. Храм, падзелены на некалькі залаў, зроблены з цэглы і мае два паверхі. Вышыня сцен—2,5 метра. Цікава, што ў храмавых будынках відаць шматлікія сляды вадасцёкаў. На думку археолагаў, гэта паказвае на тое, што на цяперашняй тэрыторыі правінцыі Хузістан у часы эламітаў выпадалі вялікія дажджы. Спецыялісты лічаць, што збудаванне гэтага храма можна лічыць цудам архітэктурнага мастацтва таго часу, бо ён захаваўся ва ўмовах дажджлівага надвор'я ў Хузістане.

У сярэдзіне храма знойдзена некалькі грабніц. У грабніцах аказалася шэсць добра захаваных шкілетаў, розныя рэчы ўжытку. Шматлікія дадзеныя сведчаць аб тым, што абрад пахавання нябожчыкаў, асабліва знатных людзей і саміх манархаў, быў звязаны з культам святой вады.

Выключную цікавасць мае табліца з клінапісным надпісам. Усяго на камені высечана 50 радкоў. Паводле заявы кіраўніка археалагічнай экспедыцыі доктара Негахбана, надпіс вельмі цяжкі для прачытання. У свеце, зазначыў ён, знойдзецца, бадай, не больш чатырох спецыялістаў, якія змаглі б расшыфраваць гэтую табліцу. Надпіс, гаворыць доктар Негахбан, відаць, адрасаваны богу агню па імю Шамаш і, напэўна, зроблены ў той момант, калі людзі паднеслі богу дар. Таму ён і ўстаноўлены ў храме пакланення.

Пры раскопках аднаго з курганоў знойдзены гліняныя збаны. Адна гліняная ваза, упрыгожаная роспісам, налічвае, на думку археолагаў, 6500 год. У гэтым жа кургане раскрыты магутныя прыгожыя сцэны, таксама ўпрыгожаныя роспісам.

Палац у Хафтане і іншыя знаходкі, заявіў доктар Негахбан, сведчаць аб існаванні на тэрыторыі сучаснага Ірана развітай цывілізацыі 6500—7000 год назад.

А. НЯНАШАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

2 верасня

Першая праграма. 11.00 — «Панарама Радзімы» (М). 11.30 — для вучняў другой змены. «Шчаслівай дарогі, дзеці!» (М). 12.00 — В. Мурадзелі. «Вялікі Кастрычнік». Сцэны з оперы (М). 16.45 — праграма перадач. 16.50 — для школьнікаў. «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс (М). 17.00 — для школьнікаў. «Рэха лета». Перадача з Вільнюса. 17.25— для дзяцей. «Прынцэса Клякса». Спектакль Дзяржаўнага тэатра лялек Латвійскай ССР. 18.25 — «Праз чвэрць стагоддзя». Сустрэча былых воінаў 208-га партызанскага палка. 19.00 — музычны спектакль. У перапынку — тэлевізійныя навіны. 22.00 — насустрач 50-годдзю Савецкай улады. «Трэці беларускі». Расказ пра Магілёўскі аўтазавод імя Кірава. 22.25 — у эфіры — «Маладосць». «Арбіта» (М). 23.10 — першынство Еўропы па лёгкай атлетыцы. Перадача з Будапешта (у запісе).

Другая праграма. 17.25 — «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 18.00 — балет Броўцына «Семург». Спектакль Ташкенцкага тэатра оперы і балета імя А. Навaі. Перадача з Ленінграда. У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 20.00 — «Эстафета навін» (М). 21.00 — «Кірмаш сельскагаспадарчых машын». Рэпартаж з ВДНГ (М). 21.10 — «Выклікаем агонь на сябе». Тэлевізійны фільм. Другая серыя (М).

3 верасня

Першая праграма. 14.25 — праграма перадач. 14.30 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Падарункі сяброў». «Прыгоды Фэфі». Тэлевізійны фільм ГДР. Пятая серыя (М). 15.00 — для школьнікаў. «Хлопчыкі і дзяўчынкі» (М). 16.00 — насустрач 50-годдзю Савецкай улады. «Сонца над Нёманам». Пра мінулае і цяперашняе Гродзеншчыны. Трансляцыя на Маскву. 16.30 — тэлевізійныя навіны. 16.50 — «Першы міжнародны форум рабочага класа». Да 100-годдзя з дня адкрыцця Жэнеўскага кангрэсу І Інтэрнацыянала (М). 17.30 — клуб кінападарожнікаў (М). 18.30 — «Кірмаш сельскагаспадарчых машын». Рэпартаж з ВДНГ (М). 18.45 — Р. Брэдберы. «Цудоўны касцюм колеру сметанковага марожанага». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля (М). 19.30 — тэлевізійныя навіны (М). 20.00 — «На агеньчык» (М). 21.00 — «Суд ідзе» (М). 21.15 — «Марыя», Мастацкі фільм. 22.40 — першынство Еўропы па лёгкай атлетыцы. Перадача з Будапешта (у запісе).

Другая праграма. 16.30 — тэлевізійныя навіны (М). 16.50 — для дзяцей. «Наша лета». Дакументальны фільм. 17.30 — «Зачараваны хлопчык». Мультыплікацыйны фільм. 18.15 — для школьнікаў. «Залатое сэрца». Тэлевізійны спектакль. 19.40 — «Маскоўскія зоркі». Фільм-канцэрт. 21.15 — «Выклікаем агонь на сябе». Тэлевізійны фільм. Трэцяя серыя (М).

4 верасня

Першая праграма. У дапамогу завочнікам. (Для першага курса тэхнікума). 8.15 — «Дэталі машын». Лекцыя першая. 9.00 — музычны антракт. 9.10 — «Тэарэтычная механіка». Лекцыя першая. 9.55 — праграма перадач. 10.00 — для школьнікаў. «Будзільнік» (М). 10.30 — «Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 11.00 — для школьнікаў. «Шлях да музыкі». Па старонках оперы С. Пракоф'ева «Вайна і мір». Перадача з Ленінграда. 12.10 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Прыходзь, казка!», «Казка пра юнака Даніяра» (М). 13.00 — «Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна- шашачны клуб. 13.30 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Сабака Чырка». Спектакль Дзяржаўнага тэатра лялек Латвійскай ССР. 14.30 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Спявае салдат». Канцэрт мастацкай самадзейнасці. Трансляцыя на Маскву. 15.00 — тэлевізійныя навіны (М). 15.20 — для вялікіх і маленькіх. Паказвае «Саюзмультфільм» (М). 15.50 — «Гданьск і Памор'е ў польскай музыцы». Перадача з Варшавы. 16.20 —Усесаюзны фестываль самадзейнага мастацтва. Канцэрт (М). 17.00 — «Гаспадары незлічоных кладаў». Да Дня работнікаў нафтавай і газавай прамысловасці (М). 17.30 — «Музычны кіёск» (М). 18.00 — «Міфы XX стагоддзя» (М). 18.30 — «Кароткія гісторыі». Тэлевізійныя мініяцюры. 19.00 — канцэрт. У перапынку — «Ідзе футбольны матч». Кінанарыс. 22.15 — у эфіры — «Маладосць». «Гарызонт». Перадача з Ленінграда. 23.15 — першынство Еўропы па лёгкай атлетыцы. Перадача з Будапешта (у запісе).

СУПРОЦЬ ВЕТРУ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

вам план на пасадку гародніны выводзіў, і там разбірайцеся.

— Вы ж прымаеце прадукцыю, — запярэчыла Рына і разгарнула пакунак. — Паглядзіце, якія. Адзін у адзін!

— Наглядзеўся, — махнуў рукой Шамко і адвярнуўся. — Нестандартнымі — возьмем.

Віктар згарнуў пакунак і сказаў Паваротнай і Струнку:

— Хадзем.

Праз некалькі мінут усе тры машыны памідораў стаялі перад гарадскім Саветам. Чарнабыльскі, Струнка і Паваротная сядзелі перад сталом загадчыка аддзела гарадскога гандлю. На стале ляжаў разгорнуты пакунак памідораў.

— Экспертызу якасці памідораў?!—пацiскаў вострымі плячыма загадчык аддзела.—Гэта не наша справа. Якасць вызначаюць на прыёмных пунктах.

Віктар зняў тэлефонную трубку і пазваніў у абласны аддзел народнага кантролю. Загадчык аддзела гарадскога гандлю зморшчыўся. скоса паглядзеў на Віктара. Ён нават сам пачуў, як у трубцы на другім канцы прагучалі прыглушаныя словы: «Перадайце трубку загадчыку».

Загадчык узяў у Віктара трубку і доўга слухаў, а потым адказаў:

— Я не зразумеў іхняй просьбы.. Добра, экспертызу арганізуем. — Паклаў трубку і злосна да Віктара:—Трэба ж дакладваць, каб усё можна было зразумець. А то адразу скардзіцца...

— Не навучыліся яшчэ дакладна выказваць свае думкі.—І Віктар іранічна ўсміхнуўся.

— Паедзеце на доследную станцыю, на ўскраіне горада, там зробяць экспертызу, а я пазваню туды,—абвясціў загадчык аддзела.

Праз нейкі час машыны з памідорамі зноў вярнуліся на базу. Чарнабыльскі, Струнка і Паваротная зноў зайшлі ў кабінет Шамко. Віктар моўчкі палажыў на стол акт экспертызы, у якім памідоры вызначаліся вышэйшым гатункам. Шамко паглядзеў акт і адкінуў яго ўбок.

— Што мне ваш гэты акт! Мы самі вызначаем якасць прадукцыі, і ніхто нам не ўказ. Цяпер мы вашых памідораў наогул прымаць не будзем. З раніцы яшчэ маглі нестандартам узяць.

— Напішыце, што адмаўляецеся прыняць, — папрасіў Віктар Шамко і падсунуў яму акт.

— Калі ласка. Думаеце, спалохаюся?—І ён не вельмі стройнымі каракулямі вывеў: «План па памідорах выкананы. Прыняць не можам» — і размашыста распісаўся.

Віктар прачытаў рэзалюцыю і ўголас, нібы перадражніваючы Шамко, з горкай усмешкай паўтарыў: «План па памідорах»... Ён згарнуў акт, сунуў яго ў кішэню, безнадзейна махнуў рукой і пайшоў да дзвярэй.

— Ну што, дамоў? Зноў высыпаць курам?— спытала Рына ў Стрункі, калі яны ўслед за Віктарам выйшлі з канторы.

— Чым высыпаць абы-куды, то лепш выехаць на вуліцу ды раздаць дзецям,—нібы ўсур'ёз прапанаваў Струнка. Ён проста сказаў так, каб падкрэсліць недарэчнасць усяе справы з памідорамі.

— Я вось што прапаную,—сказаў Віктар і паглядзеў на гадзіннік.—Дзве гадзіны дня. Паехаць на рынак і прадаць памідоры па магазіннай цане.

Струнка здзіўлена паглядзеў на Віктара.

— Дзядзька Пятро, я ўсё разумею. Не лічыце мяне... У мяне ўсе дома. Я ведаю, што за гэта галаву могуць адарваць. Але я не баюся. Трэба ламаць стары парадак гаспадарання. Такое дабро выкідваць...

— І я за тое, каб везці на рынак,—далучылася Рына да прапановы Віктара. Яна наогул згадзілася б на ўсё, што б ні прапанаваў Віктар. Ён ведаў гэта і сам.

Дзякуючы мяккай сваёй натуры згадзіўся Струнка.

Гадзіны праз тры машыны былі спарожнены.

□ □ □

Ворваль слухаў Віктара і глядзеў на яго ўтрапёнымі вачыма.

— Што ты нарабіў?—крыкнуў ён, не даслухаўшы Чарнабыльскага. — У цябе што-небудзь тут ёсць?—пастукаў Ворваль пальцам сабе па ілбе.—Ды ты ж палітычна няграматны! А яшчэ кандыдат навук... Ды не абы-якіх—эканамічных. Цяпер мне ясна, чаму цябе пратурылі з інстытута...

— А што мы дрэннае зрабілі, Максім Апанасавіч?—хацеў уступіцца за Віктара Струнка, але Ворваль закрычаў на яго:

— Не твайго розуму клопат. Маўчы. Гэта ж трэба, гэта ж трэба!—хапаючыся за галаву, паўтараў Ворваль у адчаі.—Надзвычайнае здарэнне. Саўгас, дзяржаўнае прадпрыемства, вязе сваю прадукцыю на прыватны рынак... Цяпер пра нас два гады будуць гаварыць на ўсіх нарадах... Курам на смех...

— Гэта я ва ўсім вінавата, Максім... Апанасавіч,—выйшла наперад да стала Рына. Пры людзях яна заўсёды называла мужа па імені і па бацьку.

— А як ты ў горад трапіла? Гандляваць захацела? Ці за кім пабегла? Твая справа—агароды. Ідзі, яшчэ пагаворым...

Рына пачырванела, павярнулася і, дробненька стукаючы абцасамі, пабегла да парога.

Віктар таксама крыху збянтэжыўся. «Ці не рэўнасць гэта?..—падумаў ён.—Яшчэ не хапала...» Але ён схамянуўся, падцягнуў крэсла, сеў насупраць Ворваля і сказаў:

— Максім Апанасавіч, можа я і не зусім граматны, але, на вялікі мой жаль, думку, каб саўгасам далі права самім прадаваць сваю прадукцыю, дзе ім зручна, належыць не мне. Яе выказалі вучоныя, не мной будучы. Ды і нічога страшнога з гэтым няма. Што мы іх капіталістам прадалі? Памідоры, якія мы вырасцілі, павінны былі атрымаць савецкія людзі, як мы кажам, спажыўцы. Нарыхтоўчая база замінала гэтаму. Мы ўзялі ды самі прадалі іх тым жа спажыўцам. І грошы дзяржава атрымала тыя ж самыя...

— Хоць людзі дабро наша спажывуць. А то зноў бы курам...—уставіў Струнка.

— Нам бы, на добры лад, свой магазін у горадзе мець...

— Наша справа—не гандлем займацца, а вытворчасцю, — перабіў Віктара Ворваль. — Чорт ведама адкуль у цябе гэта бярэцца. Не было мне яшчэ клопату! Грошы гэтыя,—паказаў ён чырвоным рубчастым алоўкам на пакунак, які палажыў на стол Струнка,—я не прыму. Як хочаш, так і афармляй. Да разбору справы.—Ён кінуў аловак на стол і адвярнуўся, злосна сцяўшы губы.

— Не тое мы прынеслі, дзядзька Пятро. Каб замест гэтых грошай палажылі на стол акт на спісанне памідораў, маглі б спакойна спаць. А так будзе турбот...—беручы пакунак са стала, сказаў Віктар.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

Саюз пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Алесю Пальчэўскаму з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці сястры Вольгі Восіпаўны.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ:

г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-44-04, аддзела літаратуры—3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі—3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі—3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі—3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі—2-70-83, выдавецтва—6-25-19, бухгалтэрыі—6-97-44.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда». Індэкс 63856. АТ 08788.